БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ, ЭЛУЧАЙЦЕСЯ!

№ 20

Верасень 1931 г.

Ударніца Сталінградзкага трактарнага.

Пралетаркі Нямеччыны, Францыі, Ангельшчыны!

Пратэстуйце супроць зьдзекаў над палітзьняволенымі ў Польшчы

Пад кіраўніцтвам Камінтэрну наперад за сусьветны Кастрычнік

Адозва работніц ф-кі „Комунарка", „Крупскай і „8-га сакавіка".

Фашысцкая Польшча, сьціснутая ў клешчах эканамічнага крызісу, прадаставіла волю рабочым і іх сем'ямі паміраць з голаду. Непамерныя падаткі фашысцкага ўраду выціскаюць апошнія сокі з працоўнага сялянства і зруйнавалі яго дашчэнту. Працоўныя масы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны цяжка стогнуць пад ботам белапольскага акупанта.



Арышт забастовачнага пікета ПАЗШ

Буржуазія Польшчы, ня маючы выхаду з крызісу, з жудасьцю глядзіць на сваю суседку—СССР, краіну будаўніцтва сацыялізму. **У гудкох новых фабрык і заводаў, у шуме трактараў, якія штурмуюць калгасныя палі, сусьветная буржуазія чуе свой сьмяротны прыгавор.**

Буржуазна-памешчыцкая зграя Польшчы са страхам глядзіць на крэсы, якія з кожным днём усё шырэй і шырэй ахінаюцца ў дым пажараў. Палаюць панскія маёнткі. Узмацняецца і шырыцца рэвалюцыйны рух.

Адчуваючы сваё бясьсільле, буржуазія Польшчы прабуе тушыць пажар хваляй белага тэрору. Панская Польшча, параненая крызісам, напружвае свае апошнія сілы на рашучую бойку. Лепшыя барацьбіты за пралетарскую рэвалюцыю кінуты ў засьценкі панскіх турмаў.

Жорстка распраўляюцца белапольскія каты з лепшымі рабочымі, работніцамі, сялянамі і сялянкамі, якія вышлі адкрыта на шлях барацьбы з буржуазіяй. З засьценкаў жаночай катаржнай турмы Фардону, Лукішак, Беластоцкай, Гарадзенскай і іншых турмаў мы чуем крыкі бязьлітасна катаваных нашых сёстраў па клясе.

Увядзеньне новага турэмнага рэжыму ўзаконьвае забойствы палітзьняволеных. 10 тысяч лепшых змагароў за справу рабочае клясы пераданы ў рукі жудаснай дыфэнзывы і турэмных катаў на фізычнае зьнішчэньне.

У жаночай катаржнай турме Фардону палітзьняволеным абмежавалі карыстаньне лекарскімі сродкамі. Хворыя зьмяшчаюцца ў аднэй камэры са здаровымі. Цяжка хворая палітзьняволеная тав. **Кнапава** ляжыць у камеры бяз усякай мэдычнай дапамогі. У камэрах пануе страшэнны холад і вільгаць, бо яны ніколі не ацяпляюцца.

Новы турэмны рэжым павінен быў быць уведзен з 1-га кастрычніка, але фашысцкія каты ўжо ўводзяць яго ў некаторых турмах. У Гарадзенскай і Лукіскай турмах, у турме „Павіак", жаночай турме „Сэрбія", Брыгідкі ў Львове, Тарнопаль, у Ржашове, палітзьняволеныя абвясьцілі галадоўку пратэсту супроць увядзеньня новага рэжыму. Дыфэнзыва мучыць галадаючых, кідае іх у цёмныя карцары. Ад катаваньня параліжавана і паміраe палітзьняволеная тав. **Цэйтэль.**

Фашысцкая зграя вядзе сваё наступленьне далей. Зараз урад Польшчы ўвёў на ўсёй тэрыторыі **ваенна-палявыя суды, як кару за рэвалюцыйную дзейнасьць.** Паводле новага закону па справе арыштаванага сьледзтва не вядзецца. Праз два дні пасьля арышту пракурор прад'яўляе акт абвінавачваньня і суд выносіць свой прыгавор. **Найменшая падазронасьць у рэвалюцыйнай дзейнасьці пагражае карай сьмерцю.**

Працоўныя Польшчы пад кіраўніцтвам КПП уступаюць у апошнюю рашучую бойку з капіталам. Мы, работніцы ўсяго сьвету, не павінны спакойна наглядаць за гэтай гераічнай барацьбой. У адказ на крывавую хвалю белага тэрору мы павінны яшчэ больш узмацніць сваю пралетарскую салідарнасьць. Мы, работніцы менскіх прадпрыемстваў, яшчэ шчыльней згуртуем свае рады вакол камуністычнай партыі, з узмоцненай упартасьцю будзем змагацца на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Пралетаркі Нямеччыны, Ангельшчыны і Францыі! Мы падымаем свой голас пратэсту супроць гэтых зьдзекаў. Мы заклікаем вас разам з намі падняць свой голас пратэсту супроць нячуваных у гісторыі зьдзекаў над палітзьняволенымі, супроць фізычнага зьнішчэньня дзесяткаў тысяч лепшых барацьбітоў Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Няхай фашысцкі ўрад пачуе ваш магутны голас. **Пратэстуйце супроць новага фашысцкага закону,** які адбірае мізэрныя правы ў палітзьняволеных. **Патрабуйце адмены закону аб ваенна-палявых судох. Затрымайце руку ката. Толькі міжнародная салідарнасьць пралетараў усіх краін дапаможа ў барацьбе з капіталам.**

Сьмяротная кара і сярэднявяковае катаваньне ня можа затрымаць рэвалюцыйнага руху мільённых мас працоўных. Сталёвая воля рабочае клясы ня можа быць зломлена.

Пад кіраўніцтвам Камінтэрну наперад за сусьветны кастрычнік.

Работніцы фабрык
„Комунаркі, Крупскай і 8-га Сакавіка".

ЦЕНТР. ГОСБИБЛИОТЕКА Т.С.С.Р.
Инв. № 15



Кураняты, выведзеныя ў інкубатары.

За ўдарнае выкананьне задач разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі

„Будаўніцтва скотных двароў, цялятнікаў, сьвінарнікаў і птушнікаў праходзіць зусім нездавальняюча і знаходзіцца пад яўнай пагрозай зрыву"— адзначыў ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб ходзе будаўніцтва жывёлагадоўлі.

Прычыны такога становішча—у недаацэнцы будаўніцтва і слабасьці работы кіраўнікоў саўгасаў, у адсутнасьці апэрацыйнасьці ў рабоце Белсельбуду, у цякучасьці рабочых, адсутнасьці масавай палітвыхаваўчай працы сярод іх, у нездавальняючым забесьпячэньні іх харчаваньнем. Прычына таксама ў невыстарчальным кіраўніцтве і кантролі над будаўніцтвам з боку партыйных арганізацый.

Пасьпяховаму ходу будаўніцтва перашкаджае апартуністычнае нежаданьне з боку раду работнікаў скарыстаць усе мясцовыя рэсурсы для будаўніцтва.

Дырэктыва ЦК—скончыць будаўніцтва цялятнікаў, абораў і матачнікаў для сьвіней да 15-га кастрычніка, рэшты сьвінарнікаў, птушнікаў — не пазьней 15 лістапада.

Па БССР не пазьней 1-га студзеня павінна быць скончана арганізацыя 900 фэрм па гадоўлі цялят. Да 15-га верасьня павінна быць скончана выдзяленьне калгасаў пад фэрмы і заключэньне дагавароў. Але заключэньне дагавароў ідзе зусім нездавальняюча. Дя гэтага часу заключаны дагавары замест 900 толькі на 20 фэрмах. Да арганізацыі фэрм па гадоўлі маладняка прыступілі толькі 178 калгасаў з 14 раёнаў.

Выкананьне дырэктыў партыі і ўраду патрабуе мабілізацыі ў першую чаргу ўсіх мясцовых сіл і сродкаў, ЦК прапануе крыць стрэхі абораў, сьвінарнікаў, птушнікаў саломай, глінасаломай, чаротам. Для ўнутранага абсталяваньня сьвінарнікаў выкарыстоўваць замест дошак жэрдкі; падлогу слаць з дошак найбольш нізкіх гатункаў, кладучы яе найбольш шчыльна на гліняную падлогу.

Больш ініцыятывы ў вышукваньні мясцовых магчымасьцяй і лепшай пастаноўкай працы на будаўніцтвах забясьпечым сваячасовае выкананьне ўдарнага будаўніцтва.

Важнейшай задачай у разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі зьяўляецца **камплектаваньне стада сацсэктару.**

Камплектаваньне гэта ідзе двума шляхамі: за кошт прыплоду і гадоўлі маладняка і за кошт куплі жывёлы ў Белмяса. Белмяса на працягу верасьня павінна здаць для ўкамплектаваньня фэрм 30.000 штук цялят. Але роля Белмяса ў справе камплектаваньня стадкаў павінна ўсё зьмяншацца разам з ростам вытворчай магутнасьці саўгасаў і таварных калгасных фэрм.

У справе гадоўлі маладняка — калгасам БССР баявое заданьне: на працягу 1931 году выгадаваць ня менш 265 тысяч цялят, 100.000 цялят выгадаваць у спэцыяльных фэрмах па гадоўлі цялят. Па СССР у 1931-32 павінна быць выгадавана 5,5 млн. цялят, 3,5 млн. парасят і 3 млн. ягнят.

Выканаць гэта баявое заданьне трэба як **за кошт куплі калгасамі прыплоду жывёлы ў сваіх членаў, так і шляхам аграмаджаньня часткі прыплоду.**

Неабходна таксама дабіцца рашучага павышэньня тэмпаў прыросту маладняка ў саўгасах і калгасных таварных фэрмах шляхам паляпшэньня кармленьня і нагляду за жывёлай, лепшага вэтэрынарнага абслугоўваньня, барацьбы з эпізоотыямі і г. д.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць **на барацьбу з захворваньнямі** жывёлы ў саўгасах.

Для гэтага неабходна ва ўсіх жывёлагадоўчых саўгасах устанавіць карантынныя пункты, праз якія прапускаць усю жывёлу, якая паступае ў саўгас. Неабходна таксама абавязкова адлучаць у карантын усю падазроную ў захворваньні жывёлу.



Аршанскі мясны камбінат.

У справе гадоўлі маладняка ў саўгасах і таварных калгасных фэрмах неабходна **дабіцца вырошчваньня ня менш 8—9 парасят ад аднэй пароснай маткі ў год,** ня менш 75 проц. цялят з усяго прыплоду, ня менш 80 проц. у саўгасах Аўцаводу і ня менш 65 пр. выхаду куранят з заложаных у інкубатар яек.

Неабходна таксама дабіцца **найменшай ялавасьці матачнага складу** (кароў, сьвіней, авец). Усё гэта паскорыць камплектаваньне стада за кошт уласнага прыплоду.

Другая важнейшая задача соцыялістычнай жывёлагадоўлі — гэта **найбольшае павышэньне вытворства і здачы дзяржаве таварнай прадукцыі.**

Неабходна зарплату ўсім работнікам саўгасаў перабудаваць у залежнасьці ад разьмеру вытворства і здачы дзяржаве прадукцыі. Неабходна шырока практыкаваць прэміяваньнне як асобных рабочых і работніц, так і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу тых саўгасаў і калгасных фэрм, якія перавыконваюць пляны па вытворстве і здачы таварнай прадукцыі.

Вялікую ўвагу неабходна аддаць разьвіцьцю дробнай жывёлагадоўлі (сьвінагадоўля, трусагадоўля, птушніцтва).

Неабходна дабіцца ў самы бліжэйшы час **пералому** ў адносінах да справы разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Сваячасова скончыць будаўніцтва, поўнасьцю выканаць пляны камплектаваньня стада, дабіцца найбольшай таварнасьці гаспадаркі і поўнага выкананьня плянаў па здачы прадукцыі дзяржаве — баявая задача.

Рашучая барацьба з недаацэнкай гэтага пытаньня, рашучая барацьба з кулаком і падкулачнікам, якія агітуюць за разбазарваньне жывёлы, барацьба з адыходам маладняка — дапамогуць цалкам выканаць баявыя заданьні.

Поўнасьцю і ў тэрмін выканаем свой сацыялістычны абавязак

Дамо да 1-га кастрычніка 9.000 рабочых Данбасу

Данбасу дана баявое заданьне ад ЦК УсеКП (б)— увесьці яшчэ ў бягучым годзе ў эксплёатацыю 49 капалень з гадовай прадукцыйнасьцю ў 17 млн. тон вугалю і закласьці 14 новых капалень з прадукцыйнасьцю ў 18,5 млн. тон.

Данбасу—усесаюзнай качагарцы — не хапае рабочай сілы.

БССР павінна выканаць заданьне партыі і ўраду— даць Данбасу 9.000 рабочых.

Да гэтага часу вярбоўка і адпраўка навербаваных у Данбас ідзе вельмі марудна. Беларусь адстае ад усіх іншых абласьцей СССР.

З боку раду раённых арганізацый і праўленьняў калгасаў ёсьць апартуністычная недаацэнка гэтых дырэктыў.

Барацьбой з гэтай недаацэнкай, жорсткім адпорам кулаком і іх агентам, якія шалёна агітуюць супроць вярбоўкі, даб'емся пералому ў гэтай справе.

Шырока азнаёмім з ільготамі адыходнікам усіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Дамо па прыкладзе Касьцюковіцкага раёну **сустрэчныя пляны** вярбоўкі. Будзем раўняцца па перадавікох у вярбоўцы— Бярэзінскім і Кармянскім раёнах.

Свой сацыялістычны абавязак выканаем з гонарам.

Ударніца—Маруська

Шэсьць гадзін раніцы. Сонца паказвае час выхаду на работу. Маруся раней за ўсіх на нагах. Вось яна каля рэчкі, хутка вялікімі ахапкамі льле на сябе ваду, бо праз поўгадзіны трэба разьмеркаваць рабочых на працу. Маруся старшы рабочы. Ёй самой трэба быць першай. На мяне-ж глядзяць комсамольцы навічкі, рабочыя. Сёньня перавыканаем дзеннае заданьне зноў на 5 проц.— песьціць яна думку ў галаве, завязваючы чырвоную хустачку.

Маруся **Будай** лепшая ўдарніца саўгасу „Фаніпаль-Вязынь". Яна брыгадзір штурмавой ударнай брыгады № 3. Яе брыгада заўсёды перавыконвае заданьне на 150—200 проц. Замест 1500 каліў капусты ўдарніцы з трэцяй брыгады садзяць 2600. Заўзята працуюць саўгасьнікі, упарта б'юцца камсамольцы за сілас, але заядлей за ўсіх Маруська. „А ну, хлопцы, сёньня трэба засыпаць гэту яму" — кажа яна, праводзячы пас сіласарэзкі да трактара. „Ніводнай ямы ня кінем не запоўненай"—адказваюць саўгасьнікі.

Загудзеў трактар, пайшлі ў ходпасы, цэлымі жменямі сыплецца ў яму зрэзаная трава. Гараць вочы ў хлапцоў, моцна яны трымаюцца за трамбоўку, якія час ад часу падлятаюць угару і зноў апускаюцца, утоптваючы сілас. Але не адны камсамольцы гараць запалам хутчэй скончыць сіласаваньне, рабочыя саўгасу таксама заражаны задорам Марусі, у якое пад вілкамі трава аж падлятае перш чым папасьці ў зубы сіласарэзкі. З плугам, бараной, касой—усюды Маруся першай, але больш за ўсё яна любіць грукат трактара: „сёньня я працую на „Красном путиловце" — заяўляе яна, і ружовы румянец разьліваецца па твары, калі сталёвы конь шпарка разразае, перакідваючы зямлю.

***

Цягнік падышоў да станцыі. Зусім цёмна. Мы ідзем па дарозе ў саўгас. Толькі дзе-ні-дзе ў небе мільгацяць маленькія зоркі, сьведкі начной цемры. Паабапал дарогі густы вербалозьнік, сасоньнік, груша-дічка — патаемна шэпчуць вяршалінамі. Прышлі.

Старэйшы рабочы саўгасу „Фаніпаль" ударніца Маруся Будай.

— Скажэце, дзе ў вас можна пераначаваць—пытаю я ў рабочага.

— Ды ўсюды—адказвае той.

— Як гэта ўсюды? Дзе жыве ў вас лепшая ўдарніца?

— Маруська?—сказаў ён, усьміхнуўшыся, і паказаў нам дарогу.

Падыходзім. Вялікі сад, прыгожыя чырвоныя цыганкі, палосатыя цітаўкі, дасьпяваючыя антонаўкі, а маліна аж усьміхаецца. Ніжэй яшчэ рэчка. Па сярэдзіне саду хата, супроць хаты вялікі разьвесісты клён стварае добры адпачынак у гарачы дзень для саўгасьнікаў.

***

У хаце старэнькая бабулька ды Маруся, прыбраны ложак, лаўка—вось багацьце хаты. Бацька Марусі—былы чырвоны партызан — забіт белапалякамі ў 1919 годзе.

— А матка?—пытаю я.

— Ай пра матку цяжка мне і казаць—кажа Маруся, але ўспаміны не даюць ёй забыцца аб матцы, якая захавала жыцьцё не аднаму дзесятку чырвонаармейцаў.

„Было гэта ў 1919 годзе, я была маленькая, да нас зайшлі чырвонаармейцы, матка іх накарміла, паклала спаць. Але раптоўна ўрываюцца белыя; матка зараз-жа адчыніла вокны, чырвонаармейцы выскачылі, не захваціўшы шынэляў. Бандыты жорстка расправіліся з ёю, білі ла галаве і ў грудзі, пакуль яна мёртвай не скацілася на падлогу".

Асірацела Маруся, няма куды дзецца і яна ідзе ў пастухі. Два гады камандуе яна сьвіньнямі, зімой мые бялізну, падлогу людзям. Цяжка сярод чужых малой сіротцы. У 1922 годзе Маруся паступае ў сельскую школу. Але бабулька, у якое яна жыве, ня можа зарабіць нават на хлеб. І Маруся кідае вучобу і ідзе ў батрачкі разам з бабулькай. Усебеларускія курсы вылучэнак вырываюць яе з кіпцюроў кулака. Дзякуючы ўпартасьці, амаль няпісьменная, Маруся канчае курсы. Апынулася ў саўгасе сярод рабочай моладзі. Малады запал камсамольцаў, адданасьць рабоце, лепшыя паказальнікі прадукцыйнасьці працы—уцягваюць яе ў камсамол.

Першая на вытворчасьці фабрыкі сена і малака, яна вылучаецца старшым рабочым. Адказная, цяжкая праца, але з гонарам выконвае яе Маруся. Разьмеркаваўшы брыгады: адных касіць, другіх сілас рэзаць, сама заўсёды ідзе наперадзе. Ветліва сустракаюць рабочыя Марусю. Сьвеціцца твар, гараць вочы, седзячы за рулём трактара або з вілами каля сіласарэзкі. Бабулька Марусі таксама ўдарніца, працуе ў гародзе, яе працай часта ганарыцца Маруся.

Камсамолка—батрачка, лепшая ўдарніца—Маруся яшчэ раз падкрэсьлівае тысячавольтную энэргію камсамолу, якая ўключаецца ў правады сацыялістычнага будаўніцтва. 640 тон сіласу закладзена, але гэта ня ўсё. Лёзунг „Ніводнай ямы ня кінем не запоўненай" — павінен быць выканан.

Куніна.

Койданаўскі раён.

Калгасьніцы, саўгасьніцы, па-ўдарнаму выканаем плян разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Турмы белапанскай Польшчы заліваюцца крывёю

Кожны дзень прыносіць весткі з-за кардону: галадоўка ў Горадні, галадоўка ў Варшаве, галадоўка ва Львове, Тарнопалі, галадоўка... Ва ўсіх турмах фашысцкай Польшчы адбываецца барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць.

Нябывалы гаспадарчы крызіс патрасае фундамант фашысцкай Польшчы, нязвычайны размах клясавых баёў у горадзе і на вёсцы наводзіць сьмяротны жах на буржуазію. Здань пралетарскай рэвалюцыі носіцца над Польшчай. Бачачы, што розныя способы ашуканьня шырокіх працоўных мас не дапамагаюць, што не дапамагаюць ужо і лёкаі капіталу—сацыял і нацыянал-фашысты, што працоўныя масы гоняць іх вон і пакідаюць рады соцыял-здраднікаў, фашызм зварачаецца да шалёнага тэрору.



Рабочы зьбіты паліцыяй.

Газэта буйных капіталістых **„Кур'ер Польскі"** дамагаецца зьнішчэньня камуністаў. Даўнейшыя сродкі расправы з рэвалюцыйным пралетарыятам ужо фашызм не здавальняюць. Што раз, то ўсё новая ўводзіцца зброя, уводзяцца ўсё больш дасканалыя тэхнічныя сродкі для душэньня рабочасялянскіх выступленьняў. Для задушэньня рэвалюцыйнага руху, каб стэрарызаваць працоўныя масы і падрыхтаваць магільнюю цішыню на тылох будучай вайны з СССР,—фашызм пускае ў ход бранявікі, атрутныя газы бязьлітасна расстрэльвае рабочыя дэманстрацыі, а ў турмах—павёў шалёныя атакі на жыцьцё лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы і працоўнага сялянства. Фашысцкай дыктатуры мала ўжо Луцку, **усе турмы белапанскай Польшчы абернуты зараз у крывавыя катоўні,** дзе фізычна зьнішчаюцца палоньнікі капіталу. Шляхам да гэтага ёсьць увядзеньне новага паліцэйска-дэфэнзыўнага турэмнага рэгляманту, зраўнаньне палітзьняволеных з крымінальнымі, з прафэсыянальнымі зладзеямі і бандытамі.

10.000 палітзьняволеных з бязьмежнай самаадданасьцю змагаюцца супроць атак фашысцкіх катаў, за абарону сваіх элемэнтарных правоў, правоў палоньнікаў буржуазіі, за абарону правоў, здабытых мукамі і крывёю пакаленьняў. Казэматы Лукішак, Горадні, Павіяку, Вронак, Пінску, жаночай турмы Фардон сталі сьведкамі самых дзікіх, самых барбарскіх сярэднявяковых катаваньняў палоньнікаў фашызму, накіраваных да таго, каб прымусіць іх пагадзіцца з новым турэмным рэглямантам.

Асабліва крывава распраўляюцца фашысцкія каты з палітзьняволенымі жанчынамі. Так, у **Пінскай турме** ў часе галадоўкі ў камэру для жанчын уварвалася банда турэмных наглядальнікаў на чале з начальнікам турмы—вядомым катам Копецам, і пачала іх катаваць. Амаль голых за валасы цягалі іх да ўборнай, дзе да крывы зьбівалі і замыкалі на цэлыя суткі, напоўніўшы перад гэтым уборныя вадою. **На працягу дня азьвярэлая турэмшчына некалькі р з зьбівала жанчын да страты прытомнасьці** Так былі зьбіты Е. Доўгапятава, **Ф. Розэнбаум, Д. Прашкінава і яе сястра Бэйля, М. Шапіра і Л. Пурым.**

У жаночай турме „Сэрбія" ў Варшаве палітзьняволеныя жанчыны ў часе галадоўкі пабілі ўсе вокны ў камэрах. У жаночай турме „Фардон" на Пазнаншчыне фашысцкія каты сыстэматычна вядуць атаку на правы палітзьняволеных жанчын. **З 42 жанчын гэтай турмы 19 цяжка хворыя, прычым хворыя турэмнай адміністрацыяй трымаюцца ў камэрах разам са здаровымі.** Зараз адміністрацыя турмы пачала разьбіваць іх на паасобныя групы паводле нацыянальнасьці і клясавай сьвядомасьці. Адабрана ад іх харчовая камуна, забаронены кнігі і нават буржуазная польская прэса. Прагулка зьменшана да паўгадзіны. Усё гэта зроблена па патрабаваньні дэлегата з міністэрства. Турэмныя апрычнікі пагражаюць жанчынам перааправуць іх у турэмную вопратку і зраўняць іх з крымінальнымі.

Жанчыны энэргічна рыхтуюцца да адпору, да галадоўкі.

Такія весткі ідуць з усіх жаночых турмаў фашысцкай Польшчы.

Новы турэмны рэглямант — гэта бесьперапынны ланцуг кайданоў, карцараў, сьмірыцельных рубашак, зьбіваньняў і самых тонкіх мэтадаў катаваньня. Новы рэглямэнт—гэта фізычнае зьнішчэньне рэвалюцыйнага авангарду пралетарыяту, найбольш сьвядомых сыноў рабочае клясы і працоўнага сялянства.

Палітзьняволеныя белапанскай Польшчы ў абарону сваіх мізэрных правоў хапіліся за апошнюю зброю—**за галадоўку.** Зараз няма тэй турмы ў фашысцкай Польшчы, дзе-б не адбывалася зацятая барацьба супроць наступленьня фашызму. Зараз

маганьне палітзьняволеных перарасло звычайны мясцовы характар. **Барацьба палітзьняволеных першы раз на працягу ўсяго існаваньня буржуазнай Польшчы набывае агульна-краёвы характар.**

Барацьба палітзьняволеных у казэматах фашысцкай Польшчы зьяўляецца толькі часткай, толькі зьвяном у агульнай барацьбе польскага пралетарыяту **за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры, за перамогу пралетарскае рэвалюцыі.**

Таму справа палітзьняволеных у белапанскай Польшчы зьяўляецца справаю ўсяго міжнароднага пралетарыяту, асабліва цяпер, калі ўрад крывавай дыктатуры для барацьбы з рэвалюцыйным рухам увёў ваенна-палявыя суды.

Увядзеньне ваенна-палявых судоў, а фактычна стану аблогі ва ўсёй Польшчы, сьведчыць аб слабасьці фашысцкай дыктатуры, сьведчыць аб тым, што ў Польшчы стала горача, што фашысцкая дыктатура пад магутнымі ўдарамі рэвалюцыйнай хвалі чуе сваю хуткую пагібель.

Міжнародны пралетарыят і працоўныя Савецкага Саюзу тысячамі пратэстаў пацьвердзілі сваю салідарнасьць з ахвярамі польскага фашызму.

Магутнымі дэманстрацыямі пратэсту ў Варшаве, Вільні, Львове, Тарнопалі і інш. гарадох фашысцкай Польшчы пралетарыят і працоўнае сялянства, ня гледзячы на жахлівы тэрор і розныя манэры сацыял фашысцкіх прахвостаў, выступаюць у абарону сваіх палняволеных таварышоў, братоў і сёстраў па клясе. **Дэманстрацыі гэтыя жорстка душацца крывавай фашысцкай дыктатурай.**

Шалёная атака фашызму на палітзьняволеных зьяўляецца сустаўной часткай імпэрыялістычных плянаў польскага фашызму, часткай плянаў падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР.

Таму абавязкам кожнага рабочага, работніцы, калгасьніка, калгасьніцы і ўсіх працоўных СССР, а таксама і працоўных усяго сьвету зьяўляецца— актыўна выступіць на абарону палітзьняволеных белапанскай Польшчы. Бура пратэстаў—вось якім павінен быць адказ працоўных усяго сьвету на замах крывавай дыктатуры Пілсудзкага на жыцьцё і правы 10.000 палоньнікаў капіталу.

С. Ж.

Масавае ўцяканьне сялян Польшчы ў СССР

Драпежніцкае гаспадараньне буржуазна-памешчыцкай зграі прывяло да нэндзы, голаду і галечы шырокія масы працоўных Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Магутнае разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР не дае спакою паном. Ліхаманкава рыхтуюцца яны да вайны супроць СССР. А для гэтага пану Пілсудзкаму патрэбны грошы. І яшчэ з большай сілай націскаецца падатковы прэс.

На крэсах пануе нячуваны нацыянальны ўціск Беларускія школы закрыты. Кніжкі на белар.скай мове забаронены. Памешчык і асаднік нячувана эксплёатуюць працоўных сялян Заходняй Беларусі.

За апошні час пачалося масавае ўцяканьне сялян в крэсаў і нават самой Польшчы. Сярод перабежчыкаў шмат жанчын. Большасьць маладыя. Ёсьць і такія, якія перайшлі граніцу з малымі дзецьмі.

У казарме, дзе знаходзяцца перабежчыкі, нас акружылі некалькі дзесяткаў жанчын. Худыя, змучаныя твары. Шмат расказвалі яны аб сваім горкім жыцьці за кардонам. На запытаньне, колькі сярод іх пісьменных, 5 рук паднялося ўверх. „На вёсках у нас жанчыны ў большасьці няпісьменныя"—кажа адна. „Асьвета ў Польшчы гэта толькі для багатых"—дадае другая.

Маладая дзяўчына зварачваецца да нас з запытаньнем. „Ці чулі вы пра пана Слатвінскага? Багаты пан. Яго абшары шырока раскінуліся каля мяжы. Не хапае зямлі нам і мы прымушаны пайсьці ў маёнткі на заработкі За злоты ў дзень мы працавалі ад цямна да цямна пад наглядам прыганятага пана Слатвінскага. А грошы, зароблены намі крывёю і потам, прыходзіцца выкленчваць у паноў, бо яны ня вельмі ахвотна любяць іх аддаваць".

„Нашу вёску зруйнавалі сэквэстратары*). Прыходзяць і адбіраюць карову і розныя рэчы, нават апошнюю падушку з-пад галавы за падаткі"— расказвае чорненькая дзяўчына. Слова сэквэстратар усіх усхвалявала. Яны пачынаюць разам расказваць аб прымусовым адбіраньні апошняга, што ёсьць у селяніна, за падаткі. „Мая суседка—кажа адна—выгнала сэквэстратара вон. Праз дзьве гадзіны ён вярнуўся з паліцыянтамі, і зьбілі яе да сьмерці, а ўсё, што было ў хаце, адабралі за падаткі".

Адна за другой расказваюць перабежчыцы аб масавых арыштах на вёсках. Бязьвінных паліцыя кідае ў засьценкі. Няма тэй вёскі, якая-б ня мела сваіх у турмах.

„Два хлопцы з нашай вёскі, адседзеўшы 4 гады ў турме, вярнуліся назад, але яны зусім хворыя і працаваць ня могуць"—расказвае батрачка пана Слатвінскага.

Немаладая перабежчыца расказвае аб тым, як папы актыўна дапамагаюць дэфэнзыве. „Мой сусед запрасіў папа да свайго канаючага сваяка на споведзь. Поп, прыехаўшы, замест таго, каб заняцца споведзьдзю, пачаў выпытваць—ці ёсьць на вёсцы камуністы і хто яны?"

Перабежчыцы сваімі апавяданьнямі як-бы вырвалі адну старонку з жыцьця Заходняй Беларусі і нам паднесьлі яе. Жудасьцю вее ад усяго гэтага. Неспакойны пан Пілсудзкі за крэсы. Агнём і мячом ён стараецца выжыць усё жывое. Дарэмна. Нельга закаваць у ланцуг вольны дух, які лунае сярод працоўных Заходняй Беларусі.

Працоўныя Польшчы і Заходняй Беларусі добра разумеюць, што не ўцяканьне ў СССР, а шлях змаганьня пад кіраўніцтвам КПП і КПЗБ з клясавым ворагам за дыктатуру пралетарыяту прывядзе іх да канчатковай перамогі.

Ч.

*) Зборшчыкі падаткаў.

Першая істужка 3-га агрэгату швэйнай фабрыкі „Кастрычнік“ атрымала пераходны чырвоны сьцяг

Пасьля водпуску на швэйнай фабрыцы „Кастрычнік“ быў вялікі прарыў. Гэта было ў выніку існаваньня ўраўнілаўкі і абязьлічкі і няправільнай расстаноўкі сілы. Пасьля рэарганізацыі працы паводле прамовы тав. Сталіна мы прарыў у 1-й істужцы 3-га агрэгату зьнішчылі. Трохкутнік перабудаваў сваю работу па-новаму.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі, мабілізуючы грамадзкасьць вакол выкананьня і перавыкананьня пляну, дабіліся вялізарнейшых посьпехаў.

За ліпень месяц наш агрэгат выканаў плян на 94 проц. **А ў жніўні наша істужка перавыканала плян на 100,4 проц., за што атрымала пераходны чырвоны сьцяг і была прэміявана.** Вялікую ролю ў гэтых посьпехах адыгралі работніцы - ўдарніцы. Лепшыя ўдарніцы: **Аксэльрод, Кравіцкая, Стругач, Бусловіч, Тайц, Гальперына, Ліпковіч, Спэктар, Гірыс, Адлерштэйн, Падольская, Памеранц і іншыя былі прэміяваны.**

Рабочыя і работніцы нашай істужкі ня спыніліся на дасягнутых посьпехах, а з яшчэ больш узмоцненым энтузіязмам праводзілі сваю работу далей. На сходзе рабочых быў распрацован дагавор па сацспаборніцтве паміж першай і 5 групай. **Была прынята пастанова ўзяць на буксір другую істужку**, якая выканала свой плян на 94 проц., і дабіцца да 31 жніўня 100 проц. выкананьня пляну па ўсіх паказальніках па агрэгаце. Гэтага мы дабіліся. Першая істужка 3 агрэгату перавыканала свае пляны.

У сучасны момант рабочыя і работніцы высоўваюць сустрэчны плян, ліквідаваць запазычанасьць другой істужкі па здачы прадукцыі за мінулыя месяцы. Паводле пляну **наша істужка павінна выпусьціць у дзень 228 польтаў, але мы высоўваем сустрэчны на 270 у дзень.**

Трэба і надалей усе гэтыя посьпехі замацаваць.

Памяранц.

Менск.

4-ты фасон—кандыдат на атрыманьне пераходнага сьцягу

Доўгім радам расьцягнуўся па правым баку першага паверху фабрыкі „8-га сакавіка“ 4-ты фасон. Раней гэты фасон недавыконваў сваёй нормы 350 штук. Але рабочыя і работніцы фасону парашылі змагацца за выкананьне пляну і за атрыманьне пераходнага сьцягу фабкому і партячэйкі.

Рабочы - вылучэнец фабрыкі „Кастрычнік“ зараз інструктар 4-га фасону, ня раз пазіраў на гэты сьцяг і пры перадачы яго 15-му фасону заявіў: „запішэце 4-ты фасон у кандыдаты на атрыманьне сьцягу“. Гэта заява выклікала сьмех сярод рабочых, бо ведалі адставаньне 4-га фасону.

Дошка выкананьня дзённага заданьня вісіць на дварэ фабрыкі, каля яе заўсёды шмат народу. Кожнага цікавіць выкананьне пляну цэхам, агрэгатам. Разам з лічбамі 225—315—349 красуецца лічба 500.

3-га верасьня. 4-ты фасон. Заданьне 350 штук — выкананьне 500 штук. **Гэта было дасягнута дзякуючы пераводу 4-га фасону з 1-га верасьня на індывідуальную зьдзельшчыну.** Разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва рабочыя добра ўзяліся за працу.

Лепшыя ўдарніцы фасону тав. **Чэрток і Бурава** аддана змагаюцца за колькасьць і якасьць прадукцыі. На твары Гайстара радасная ўсьмешка. Ну, пытаюць рабочыя—няўжо 500.

600 зробім, калі будзе падзьменная група. Зараз заява тав. Гайсьцера не зьяўляецца сьмешнай. 4-ты фасон кандыдат на атрыманьне пераходнага сьцягу.

А. К.

Менск.



Пабудова новай турбіннай майстэрні.
Завод „Чырвоны Пуцілавец“

Аднаасобніцы в. Дараганава і Кармозы—ударніцы ўборачнай

Ударніца-калгасьніца т. Сташко прэміявана экскурсіяй па СССР

Уборка яравых і азімых пасеваў па Старадароскім раёне прайшла са значнымі посьпехамі.

Вялікія прарывы наглядаліся ва ўборцы тэхнічных культур. Але, дзякуючы адданасьці жанчын-калгасьніц у часе ўборкі, увядзеньню зьдзельшчыны, прарывы былі ліквідаваны.

У калгасе „Камінтэрн“ быў вялікі прарыў па ўборцы. **Працоўныя жанчыны-аднаасобніцы пасёлку Дараганава абвясьцілі сябе ўдарніцамі на час уборачнай кампаніі і накіраваліся брыгадай у 11 чалавек у калгас „Камінтэрн“ па праполцы гароду.** У калгас „Камінтэрн“ улілося 7 гаспадарак і 3 адзіночкі.

Працоўныя жанчыны-аднаасобніцы вёскі Кармозы таксама арганізавалі ўдарную брыгаду з 20 чалавек па дапамозе ва уборцы ільну калгасу імя Фрунзэ. За 8 гадзін працы ўбрана 1,5 га ільну. Уборка, абмалот і расьціл ільну ў калгасе імя Фрунзэ скончаны. Патрэбна браць прыклад з кармозаўскіх жанчын.

У калгасах жанчыны паказвалі ўзоры працы. Так, **ударніца-калгасьніца Сташко Ядзя** з калгасу „Сацыялізм“ заўсёды перавыконвала нормы выпрацоўкі. **Сташко, як лепшая ўдарніца, прэміявана праўленьнем калгасу і газэтай „Калгасьнік Беларусі“,** паездкай ў далёкую экскурсію па БССР.

Не адставалі ад Сташко і калгасьніцы-ўдарніцы **Караленя Я., Караленя Т., Розум Г., Саскова Т., Саскова М., з калгасу „Камунар“**, Полацкага сельсавету, **Яны заўсёды перавыконвалі нормы выпрацоўкі ў паўтара-два разы.** Дзякуючы гэтаму як уборка азімых і яравых, так і ўборка ільну ў калгасе скончаны сваячасова. Выцераблена 60 коп., якія абмалочаны і пасланы.

Старадароскі раён. **М. Шэшка.**

Узор ударнай работы

Замест 50 снапоў выбіраюць 75

У калгасе „Іскра“ (Бяседавіцкага сельсавету, Касьцюковіцкага раёну) па ініцыятыве камсамольскай ячэйкі **арганізавана ўдарная жаночая брыгада. Брыгада складаецца з 13 дзяўчын, якія сапраўды па ўдарнаму працуюць на ўборцы і апрацоўцы ільну. Замест 11 дзён уборкі, вызначаных праўленьнем, брыгада дала сустрэчны—выбраць лён за 8 дзён.**

Заданьне ў дзень па ўборцы ільну 50 снапоў, але ўдарніцы выбіраюць па 75 снапоў, перавыконваючы заданьне на 150%. Дзякуючы энтузіязму ўдарніц лён сабраны за 8 дзён.

Зараз, разгортваючы яшчэ больш сацспаборніцтва і ўдарніцтва, пераключыліся на цераб-леньне. Да 17-га МЮД'у 12 ударніц з брыгады прыняты ў камсамол і адна ў кандыдаты партыі.

Лупікава Ніна.

Слаба разгорнута ўдарніцтва

Калгас „Колас Калініна“ мае ільнаводчы ўхіл. У гэтым годзе было засеяна 130 гектараў ільну. На сёнешні дзень вырвана толькі 50 *га* ільну, што складае менш паловы. Засталося яшчэ 80 *га*.

Калгасьніцы, якія абвясьцілі сябе ўдарніцамі, працуюць сапраўды ўдарнымі тэмпамі. Заданьне, па ўборцы яны выканалі за адзін дзень замест вызначаных 2¼ дзён.

Але лік ударніц у калгасе малы. Сярод калгасьніц слаба разгорнута ўдарніцтва і сацспаборніцтва.

У калгасе мы пачалі сеяць жыта. Слаба прасоўваецца справа сіласаваньня. З 4-х аддзяленьняў калгасу толькі ў адным заложана сіласная яма.

Трэба шырэй разгарнуць ударніцтва і сацспаборніцтва ў калгасе і мабілізаваць усіх калгасьнікаў і калгасьніц на ліквідацыю прарываў ільнаўборкі і сіласаваньня. **Ударнік.**

Асьвейскі раён.

Выклікаем на сацспаборніцтва па ўборцы бульбы

Агульны сход дэлегатак кравецкай арцелі „Бальшавік“ (Жлобін), абгаварыўшы пытаньне ўборкі бульбы ў саўгасах і калгасах, арганізаваў **дзьве ўдарныя брыгады з 35 чалавек,** якія будуць практычна дапамагаць калгасам ва ўборцы.

Брыгады выклікаюць іншыя дэлегацкія пункты гораду на сацспаборніцтва ў практычным удзеле ва ўборцы бульбы.

Па даручэньні сходу

М. Паўлючэнка.

Датэрмінова скончым уборку ільну

У калгасе „Пралетары“ ўборка ільну была скончана датэрмінова. Калгасьніцы былі падзелены на брыгады. Паміж брыгадамі былі заключаны сацумовы на лепшае правядзеньне ільнаўборкі.

Ударніцы калгасьніцы выпрацоўвалі ў дзень 9 коп у той час, як калгасьнікі выпрацоўвалі толькі 7 коп.

Па скончэньні ўсёй уборкі выяжджаем на дапамогу калгасу „Чырвоны Партызан“.

Калгасьніцы ўзялі на сябе абавязак насадзіць 35 га саду.

Дрысенскі раён. **Дэлегатка.**



Былы дом памешчыка—пад агульнае памяшканьня рабочых саўгасу.

Праверка выканаиьня калдагавароў— важнейшая палітычная кампанія

Аднэй з важнейшых умоў выкананьня і перавыкананьня народна-гаспадарчага пляну 3 га рашаючага году пяцігодкі зьяўляецца рэалізацыя гаспадарчымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі абавязацельстваў па калдагаворах. Для гэтага неабходна праводзіць сыстэматычную праверку іх выкананьня. Абавязкі, якія выцякаюць з калдагавароў, павінны быць даведзены да кожнага рабочага, не абмяжоўваючыся агульнай папулярызацыяй іх.

Аднак, што мы маем у сапраўднасьці? Пасьля перазаключэньня калдагавароў ва многіх прадпрыемствах іх амаль забываюць. Ёсьць выпадкі, калі дагавор да гэтага часу нават яшчэ не надрукаваны і не распаўсюджан сярод рабочых.

Побач з тымі дасягненьнямі, якія мы маем у прамысловасьці БССР у параўнаньні з мінулым годам (значны рост рабсілы, пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне радам прадпрыемстваў прамфінпляну, уступленьне ў строй новых прадпрыемстваў), мы маем зараз прарыў у выкананьні прамфінпляну. Прамфінплян па прамысловасьці ВСНГБ выканан толькі на 85 проц., а па НКСнабе—на 73,8 проц. Прагулы па няўважлівых прычынах павялічыліся з мінулага году ад 0,32 проц. да 0,96 проц. (у тры разы), значная цякучасьць рабочае сілы. Гаспадарчы разрахунак укараняецца марудна. Рацыяналізатарскія мерапрыемствы праводзяцца несваячасова, а па радзе прадпрыемстваў зусім слаба.

Ня лепш стаіць справа з рэалізацыяй плянаў і абавязацельстваў, прадугледжаных у калдагаварох па ахове працы, сацыяльна-бытавым будаўніцтве, са становішчам рабочага забесьпячэньня, грамадзкага харчаваньня

Каб стварыць рашучы пералом у гэтым напрамку, УсеЦСПС і ЦСПСБ далі катэгарычныя дырэктывы правесьці на працягу жніўня і верасьня масавую праверку выкананьня калдагавароў па ўсіх галінах. Аднак, ня гледзячы на тое, што жнівень месяц ужо прайшоў, многія прадпрыемствы яшчэ ня ўключыліся належным парадкам у праверку. Ёсьць прадпрыемствы, на якіх фармальна праверка ўжо скончана, але фактычна яна зьмазана. Гэта праверка павінна мабілізаваць увагу шырэйшых мас рабочых на рэалізацыю задач, вызначаных правадыром нашай партыі тав. Сталіным у прамове на нарадзе гаспадарнікаў.



Пабудова порту ў Гомелі.

Праверка калдагавароў па сваёй гаспадарча-палітычнай важнасьці і выніках, якія яна (праверка) павінна даць у сэнсе выкананьня прамфінпляну і паляпшэньня сацыяльна-бытавых умоў, адыгрывае такую-ж ролю, як і кампанія па перазаключэньні калдагавароў. У сапраўднасьці ёсьць недаацэнка гэтай важнейшай работы радам прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый. Ва многіх прадпрыемствах, якія яднаюцца саюзам лесдрэў, праверка прайшла без належнага ўдзелу шырокіх рабочых мас, аднабакова. Уся ўвага была ўдзелена пытаньню выкананьня абавязацельстваў, узятых на сябе адміністрацыяй, і амаль ня цікавіліся, як выконваюцца абавязацельствы, узятыя па калдагаварох рабочымі і прафарганізацыямі. Такое становішча па „Чырвоным мэталісьце", па саюзе сувязі і інш. Мясцкомы Полацкай, Віцебскай і Мазырскай кантор Саюзтрансу ў габінэтным парадку праверылі, ці сваячасова выдаецца мыла, спэцвопратка, і на гэтым уся праверка была скончана. Пытаньні працадысцыпліны, выкананьня прамфінпляну, становішча сацбытавых умоў іх не датычыць.

Паасобныя прафработнікі і гаспадарнікі лічаць праверку калдагавароў у сучасны момант несваячасовай таму, што яны зараз заняты прамфінпляным. Усе гэтыя факты паказваюць, што некаторыя прафэсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі недаацэньваюць важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію, якая павінна дапамагчы ліквідацыі прарываў.

Пры правядзеньні праверкі выкананьня калдагавароў ні ў якім разе нельга абмежавацца высьвятленьнем і рэгістрацыяй фактаў; асноўная задача пры праверцы—стварыць рашучы пералом у бок шырокага ўкараненьня зьдзельшчыны, увядзеньня на працаёмістых і масавых работах прагрэсыўнай сыстэмы аплаты, зьнішчэньня абязьлічкі, паляпшэньня матар'яльна-бытавога абслугоўваньня рабочых, работніц і інжынэрна-тэхнічных сіл, рашучага зьнішчэньня цякучасьці і г. д.

У часе праверкі неабходна дасканала высьветліць сапраўдных вінаватых у невыкананьні абавязкаў па калдагаворы з прыцягненьнем іх да суда рабочай грамадзкасьці — як адміністрацыю, так і паасобных рабочых — прагульшчыкаў, лятуноў. Дабіцца шырокага ўкараненьня брыгад па сацыялістычна-гаспадарчым разрахунку, зьмена-сустрэчнага плянаваньня, збор прапаноў рабочых і работніц па палепшаньню вытворчасьці, лепшай арганізацыі працы. У тых выпадках, калі праверка праведзена фармальна, без належнага ўдзелу мас, неабходна правесьці паўторную праверку з найбольшым удзелам у праверцы рабочых і работніц. Праверка калдагавору павінна забясьпечыць выкананьне пляну бягучага году і найлепшую падрыхтоўку да 4-га заключнага году пяцігодкі.

І.

Перабудуем работу паводле прамовы т. Сталіна

(Унутрыфабрычны рэйд)

Гудок прарэзьліва, працяжна ўздыхнуў. Яго гукі і сьведчаць аб сканчэньні работы першай зьмены.

Перапынак. Кожны заняты сваёй справай. Брыгада правярае выкананьне калумовы і ўносіць папраўкі. Ударнікі запаўняюць анкеты для паступленьня на рабфак, камсамольцы заўзята рыхтуюцца да 17 МЮД-у.

Сёньня на фабрыцы „8-га сакавіка“ асаблівы імпэт да працы, асаблівая жывасьць, бегатня.

— Рэйд... Рэйд!—чуецца дзе-нідзе сярод рабочых.

— Усе пойдзем, раскажам аб нашых балячках, будзем выкрываць і выпраўляць. Што гэта за рэйд? Запішы мяне, запішы— просяць і Бахрах, і Хэйфэц.

У сталоўцы адкрыўся запіс. Запісалася 19 чалавек. Не хапала часу, сьпяшаліся на дэманстрацыю сустракаць Чырвоную армію. У часе дэманстрацыі працягваўся запіс. Ударніцы запісаліся першымі.

* * *

Памяшканьне фабкому перапоўнена. Не хапае месц. Хто прымасьціўся на вакне, хто на скрынках, хто каля стала.

Па сярэдзіне трыкутнік фабрыкі: сакратар парткалектыву, дырэктар фабрыкі, старшыня фабкому. Вакол ударнікі, іх 40 чалавек. 19 запісаных прывялі з сабой яшчэ 21. Што-ж высьветліла брыгада?

Фабрыка „8-га сакавіка“ ў параўнаньні з папярэднім кварталам мае значныя зрухі ў выкананьні прамфінпляну. За апошні месяц фабрыка выканала прамфінплян на 108 проц., дзякуючы таму, што пры абноўленым кіраўніцтве фабкому і парт'ячэйкі ўведзены рацыяналізатарскія мераприемствы, жорсткі кантроль над якасьцю прадукцыі, узмоцненая барацьба з прагульшчыкамі шляхам увядзеньня таварыскіх судоў. Вытворчая нарада разгарнула работу і высоўвае канкрэтныя мераприемствы па паляпшэньн якасьці прадукцыі. На фабрыцы выходзяць 3 цэхавыя газэты, якія за апошні час жорстка бічуюць прагульшчыкаў і паказваюць лепшых ударнікаў-змагароў за прамфінплян.

Фабрыка да гэтага часу не перайшла на індывідуальную зьдзельшчыну таму, што адміністрацыя не аддавала ўвагі гэтаму пытаньню. Рабочыя аплачваюцца па украінскай сыстэме вырабу апошняй рукі і таму атрымліваецца ўраўнілаўка ў зарплаце, і рабочыя не зацікаўлены ў колькасьці і якасьці выпуску прадукцыі. Ня гледзячы на тое, што парт'ячэйка прапанавала перавесьці 15 фасон на зьдзельшчыну з 25-га жніўня і ўсю фабрыку з першага верасьня, гэта яшчэ не праведзена, бо ня былі арганізаваны масы на прапрацоўку і правядзеньне гэтага пытаньня. У выніку непадрыхтаванасьці адміністрацыйнага пэрсаналу, інструктароў і брыгадзіраў пры пераводзе 15-га фасону на зьдзельшчыну, ён ня быў забясьпечан рэзэрвымі рабочымі, не хапала канвэеру, ня была наладжана праца ярлычніц, чаму ярлыкі былі пераблытаны і ўліку працы кожнага рабочага нельга было зрабіць, таму зьдзельшчына была сарвана. Намесьнік дырэктара тав. Шапіра тлумачыць усё гэта непадрыхтаванасьцю тэхнічных умоў, а не бюракратычнымі адносінамі адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу.

На гаспадарчы разрахунак фасоны яшчэ да гэтага часу не перайшлі.

Аб ліквідацыі абязьлічкі толькі яшчэ абгаварылі на вытворчай нарадзе, але нічога ня зроблена і на фабрыцы пануе абязьлічка. За машыны і інвэнтар ніхто не адказвае, у выніку гэтага вялікія страты. Рабочы Рудзеня другога верасьня на прышываньні каўняроў зламаў 15 іголак. Таксама калі другога верасьня ў закройным цэху прышлося зразаць з полаў 6 сантымэтраў, што прывяло да страты 36 руб. 47 кап.; іх вылічылі з работніц-накладчыц, рэзчыкаў і закройшчыкаў, у той час як павінен быў адказваць той, хто адказ(н за гэтую працу.

Неабходна хутчэй перавесьці ўсю фабрыку на індывідуальную зьдзельшчыну, устанавіўшы правільны ўлік работы і правільную расстаноўку рабочых. Увесьці гаспадарчы разрахунак і ліквідаваць абязьлічку.

Неабходна сканцэнтраваць усю ўвагу партыйнай, камсамольскай арганізацыі, адміністрацыі і ўсіх рабочых і работніц на ажыцьцяўленьне ўказаньняў т. Сталіна.

Брыгада часопісі: „Бел.раб. і сял.“ **Куніна, Малева, Ляльчук, Лапіда, Гурэвіч, Яхно, Кручкоўскі, Марголіна, Міхалёнак, Грэйсух, Бухоўка, Зобіна, Марголіна, Кац, Яхныш і Місьневіч.**

Больш ініцыятывы і актыўнасьці ў распаўсюджаньні пазыкі „3-ці рашаючы“

Нікалаева і Грачора падпісаліся на пазыку на 200 проц. зарплаты.

Падпіска на пазыку „3-ці рашаючы год“ у зборачным цэху акулярнай фабрыкі была праведзена сваячасова. Усе работніцы падпісаліся на 100 проц. месячнай зарплаты. Работніцы тав. **Нікалаева і Грачова** падпісаліся на 200 проц. сваёй месячнай зарплаты.

Акулярная ф-ка, Віцебск.

Андреева, Голубева, Піруціна, Нэплох.



Агульны выгляд Любарэцкай цагельні.

Далоў рэлігійны дурман

Ніводнага прагулу ў часе рэлігійных сьвят

Надыходзяць асеньнія сьвяты, надыходзяць „страшныя дні", дні, калі яўрэйскае духавенства напружвае ўсе свае сілы для адурманьваньня працоўных. Чаго толькі ня прыдумала яўрэйская рэлігія для таго, каб затуманіць галовы працоўных у гэтыя „страшныя дні".

„Нават рыба ў вадзе і тая дрыжыць ад суда гасподняга",—кажуць равіны. За месяц да сьвят па ўсіх сынагогах чуюцца трубныя гукі „шойфэру"—гэта рыхтуюцца разганяць шатану.

У дзень новага году суд пачынаецца, у судны дзень (Іём-кіпур). Канчаткова зацьвярджаецца прыгавор толькі на 7-мы дзень сьвята—„кушча" („сукес"). Так на працягу трох тыдняў рэлігія трымае працоўных у страху перад судом божым.

Каму патрэбны гэтыя „страшныя дні" з іх дурнымі звычаямі, забабонамі, якія ідуць яшчэ з самых даўніх часоў дзікасьці? Яны патрэбны перш за ўсё эксплёататарам, якія дрыжаць перад судом эксплёатаваных. Усе павінны дараваць адзін другому. Раб павінен дараваць пану, рабочы—свайму гаспадару-фабрыканту, ніякай злосьці, ніякіх крыўд, бо ўсе аднолькавыя перад судом госпада. Гэтыя сьвяты патрэбны прадстаўніком рэлігіі—рабінам, разьніком і г. д.,—каб набіць свае кішэні. „Ніхто не павінен заяўляцца перад асобай госпада з голымі рукамі—так сказана ў бібліі. І прадстаўнікі госпада непарушна захоўваюць гэты закон.

Гэта зграя пускае ўсё ў ход, каб зацямніць галовы і вытрасьці кішэні працоўных. Таксама, як і іншыя рэлігіі, іудзейская рэлігія захоўвае звычаі старых часоў, каб гаспадарыць над працоўнымі. Аб чым сьведчаць гукі „шойфэру". Гэта дзікае павер'е першабытных людзей аб тым, што пры дапамозе гукаў разганяюцца „злыя духі". Што такое „капорэс"? Гэта выкуп сваіх „грахоў" жывёламі, ахвяруючы іх багом. І ўсю гэту брахню пашыраюць рабіны, ў карысьць сваёй кішэні.

Працоўныя жанчыны—работніцы, калгасьніцы, саматужніцы—павінны выгнаць са свайго быту ўсе рэлігійныя сьвяты, у тым ліку і „страшныя дні". Мы перабудоўваем быт па-сацыялістычнаму. Мы павінны змагацца з усімі, хто ўносіць у наш быт рэшткі былога рабства. А між іншым гэтыя рэшткі ў нас ёсьць. У мінулым годзе на радзе прадпрыемстваў быў цэлы рад нявыхадаў на працу работніц у дні новага году і асабліва ў „судны дзень". Клясавы вораг выкарыстаў нашу малакультурнасьць у сваіх інтарэсах—інтарэсах зрыву пяцігодкі, зрыву сацыялістычнага будаўніцтва.

Пасты недапушчальны ў асяродзішчы працоўных, бо гэта льле ваду на млын клясавага ворага. На брахню клясавых ворагаў—рабінаў, разьнікоў і інш. працоўныя жанчыны адкажуць: ніводнага прагулу ў рэлігійныя сьвяты! Прэч рэлігійнае сьвята! Прэч пасты!

Александровіч.

Замест сьвяткаваньня рэлігійных сьвят—усе на ўборку гародніны

(Канфэрэнцыя жонак рабочых г. Менску)

Пад гукі аркестру, калёна за калёнай, падыходзяць жонкі рабочых і служачых Менску да дому Камасьветы.

Плякаты сьведчаць аб выразнасьці мэты канфэрэнцыі. **„Усе на ўборку гародніны", „Прэч рэлігійныя сьвяты"**—кажуць лёзунгі.

Заля гудзе, поўная народу. Поўны збор канфэрэнцыі сьцьвярджае ўзьняцьце культурнага ўзроўню жанчын.

Тав. Шуссэр з гаркому КП(б)Б абвяшчае канфэрэнцыю адкрытай.

— Забесьпячэньне рабочых цэнтраў гароднінай — важная задача. Неабходзен удзел усёй грамадзкасьці, хатніх гаспадынь ва ўборачнай кампаніі—кажа прадстаўнік Белкаапсаюзу.

Дружна падхапілі ўдзельніцы канфэрэнцыі пытаньне, пастаўленае тав. Вайцаховічам.

Тав. **Ярыш** з 6-га жакту горача выказваецца: „Ніводнай бульбіны, ніводнага бурака ня кінем на полі. Усе выйдзем на дапамогу ўборцы гародніны". Дружныя воплескі сьведчаць аб аднадушнай згодзе канфэрэнцыі.

Тав. **Ідэльсон** з 12-га жакту ўносіць прапанову: „Замес сьвяткаваньня „страшных" яўрэйскіх сьвят усе хатнія гаспадыні нашага жакту 13 верасьня павінны выйсьці на працу".

Хатнія гаспадыні добра зразумелі значэньне ўмацаваньня прыгародных гаспадарак і важнасьць іх удзелу ва ўборцы гародніны.

— Ня менш важная задача хаваньня гародніны. У нашых загатоўчых пунктах не хапае тары. Мы павінны дапамагчы арганізацыі хаваньня гародніны. Усе бочкі і пагрэбы, якія ў нас ёсьць, мы аддамо ЦРК пад хавальнікі—кажа тав. **Вострыкава** з 13-га жакту.

Прамова прадстаўніка ЦК саюзу ваяўнічых бязбожнікаў падняла хвалю актыўнасьці ўдзельніц канфэрэнцыі.

— Рост прамысловасьці і культурнага будаўніцтва ў Менску часта ўпіраецца ў недахват жыльлёвых памяшканьняў, у той час, калі ў нас ёсьць дзесяткі цэркваў, сынагог, касьцёлаў—рэштак рэлігійнага дурману—кажа тав. Палкоўская.—Я прапаную зачыніць гэтыя гнёзды клясавых ворагаў і аддаць іх пад культурныя ўстановы.

Мора рук, галасы „правільна" паказалі салідарнасьць канфэрэнцыі. Канфэрэнцыя пастанавіла:

У рэлігійныя сьвяты ўсе пойдзем працаваць па ўборцы гародніны. Канфэрэнцыя хадайнічае перад гарсаветам аб зачыненьні ўсіх цэркваў, сынагог, касьцёлаў і аддачы іх пад культурныя ўстановы.

Хатнія гаспадыні таксама памятаюць свае інтэрнацыянальныя абавязкі. Тав. **Іванова** і т. **Шмідт** (16-ты жакт) сабралі ў карысьць сем'яў політзьняволеных 270 руб. Удзельніцы канфэрэнцыі сабралі 400 руб. На пабудову падводнай лодкі „Бязбожнік" кожны жакт абавязваецца ўнесьці 52 руб.

Канфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б і Менгаркому КП(б)Б.

К.

Сталоўка—цэх саўгасу

Саўгас Анопаль, Койданаўскага раёну, заўсёды меў прарыў у забесьпячэньні сябе належнай колькасьцю рабочай сілы. Ішлі рабочыя на работу ў саўгас і праз некаторы час ухадзілі. Наглядалася вялікая цякучасьць рабочай сілы. Цяжка было ўтрымаць хаця-б малую колькасьць рабочых сэзоньнікаў. Часта саўгас заставаўся напалову без рабочай сілы. Пляны будаўніцтва зрываліся.

Рабочыя сэзоньнікі ня ішлі туды, дзе няма добрага жыльля, дзе не арганізавана грамадзкае харчаваньне.

Пры абгаварэньні плянаў падрыхтоўкі і правядзеньня бальшавіцкай веснавой сяўбы было цьвёрда вырашана: арганізаваць грамадзкае харчаваньне, палепшыць бытавыя ўмовы рабочых.

Прарыў мінулага году ў будаўніцтве добра навучыў трыкутнік саўгасу, а таму зараз ён ад гаварыльні, шуміхі перайшоў да канкрэтных дзеяньняў. Адрамантавалі памяшканьне, купілі інвэнтар, пасуду, рыхтавалі прадукты.

Хутка надышла вясна. Саўгас начаў сяўбу. Да гэтага часу скончыўся рамонт.

Сталоўка гатова. І наяўнасьць сталоўкі з першых-жа дзён пачала адчувацца. Рабочыя нежанатыя адразу пачалі карыстацца грамадзкім харчаваньнем. Ім непатрэбна ўжо было гатаваць сабе страву. Яны ішлі ў сталоўку і бяз ніякага спазьненьня выходзілі на работу. Сталоўка значна дапамагла ў вярбоўцы рабочай сілы, дапамагла ў пасьпяховым правядзеньні сяўбы.

Спачатку сталоўка была зроблена насьпех. Памяшканьне было ня поўнасьцю адрамантавана. Не хапала неабходных рэчаў. Для таго, каб паесьці, прыходзілася станавіцца ў чаргу, чакаць, пакуль паесьць папярэдні таварыш.

Санітарнае становішча было дрэннае. У сталоўцы асабліва на кухні было шмат гразі, рэдка калі мылася падлога. Часамі нават у страву пападала сьмецьце.

Такая сталоўка мала спрыяла справе выкананьня прамфінпляну. Яна яшчэ поўнасьцю не адпавядала свайму прызначэньню.

Тады перад трыкутнікам і ўсёй грамадзкасьцю паўстала пытаньне рашучым чынам перабудаваць работу сталоўкі, паставіць так грамадзкае харчаваньне, каб яно сапраўды стала на службу выкананьня плянаў гаспадарчага будаўніцтва.

Цалкам адрамантавалі памяшканьне, пабялілі сьцены, набылі сталы. У кухні паклалі новую падлогу, зрабілі пліту.

Для таго, каб сталоўку поўнасьцю забясьпечыць тлушчамі і мясам, арганізавалі пры сталоўцы сьвіна-адкормачны пункт, арганізоўваецца малочная фэрма.

Зараз прыемна зайсьці ў сталоўку. Белыя сьцены, чыста вымыта падлога, сталы засланы чыстымі абрусамі, на кожным стале стаіць графін з перагатаванай вадой, салянкі з сольлю і кветкі. Вечарам сталоўка асьвятляецца электрычным сьвятлом.

Харчы гатуюцца добраякасна і няма аднастайнасьці. Калі сёньня на абед падаецца боршч і бульба смажаная, дык заўтра бульён і каша. Страва заўсёды гатуецца з мясам.

Часта для таго, **каб не адрываць рабочых ад палявых работ. ім у тэрмасах абеды возяцца на поле.**

Сталоўка зьяўляецца ня толькі месцам, дзе можна пад'есьці, але і культурным месцам. Зайшоўшы ў сталоўку, можна і газэты пачытаць. Грамадзкім харчаваньнем ахоплены ўсе рабочыя, сэзоньнікі — нежанатыя і часткай сямейныя.

Улік выдаткаваных прадуктаў у сталоўцы саўгасу „Анопаль" пастаўлен на належную вышыню. Кожны вечар загадчык сталоўкі тав. **Бортнік** дае справаздачы ў кантору аб выдаткаваньні прадуктаў на другі дзень. Калі раней сталоўка давала страты, дык зараз яна дае прыбытак.

Сталоўка ў саўгасе „Анопаль" зьяўляецца сапраўдным цэхам саўгасу. Яна поўнасьцю пастаўлена на службу прамфінпляну.

Гэта сталоўка зьяўляецца ўзорам бальшавіцкай работы трыкутніка саўгасу і рабочых. Трэба адзначыць добрую работу работніц сталоўкі **Матрунчык** і **Ракавец**, якія **ўсю энэргію аддаюць справе паляпшэньня работы сталоўкі.**

Сталоўка саўгасу „Анопаль" зьяўляецца прыкладам для іншых саўгасаў Беларусі, якія ўсё яшчэ ня здолелі грамадзкае харчаваньне падпарадкаваць задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

Рабочы калектыў саўгасу „Анопаль" можа ганарыцца сваім цэхам—рабочай сталсўкай.

Янка Палескі.

Палепшым працу сталоўкі

На нашым заводзе ўжо больш году будуецца сталоўка, але да гэтага часу яна яшчэ не пабудавана. Старая сталоўка была нядаўна адрамантавана. Былы загадчык сталоўкі за антысанітарнае становішча атрымаў 6 месяцаў прымусовай працы. Зараз палепшылася санітарнае становішча ў сталоўцы.

Але якасьць абедаў вельмі дрэнная. Рабочыя шмат гавораць аб гэтым, але ні заўком, ні партколектыў ня прымаюць рашучых крокаў да паляпшэньня якасьці абедаў

Трэба як можна хутчэй узяцца за гэту справу і зрабіць сталоўку сапраўдным змагаром за выкананьне прамфінпляну.

Яхновіч.

Завод „Дрэваапрацоўшчык", Менск.



Ст. брыгадзір шчотачнага цэху. ф-кі „Чырв. Тэкстыльшчык".

За ўдарнае выкананьне дырэктыў аб дашкольным выхаваньні

Пастанова ЦК КП(б)Б аб становішчы і пэрспэктывах разьвіцьця дашкольнага выхаваньня набывае ў сучасны момант асабліва вострае палітычнае значэньне.

Задача максымальнага ўцягненьня працоўных жанчын у прамысловасьць і сацыялістычную перабудову вёскі настойліва патрабуе **арганізацыі іх бытавога абслугоўваньня, асабліва арганізацыі грамадзкага камуністычнага выхаваньня дзяцей.**

Да гэтага часу гэта ў нас найбольш адсталы вучастак нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Тут патрэбен пералом, патрэбны тэмпы.

Неабходна шырока разгарнуць будаўніцтва дзіцячых устаноў і перабудаваць працу старых, прыстасаваўшы іх да ўмоў працы работніц і калгасьніц.

Вялізныя задачы, пастаўленыя ў пастанове ЦК, змогуць быць выкананы толькі пры **актыўным удзеле самих працоўных, асабліва працоўных жанчын.**

Неабходна прыцягнуць і сродкі самога насельніцтва праз арганізацыю дашкольнай каапэрацыі.

Работніцы, саўгасьніцы і калгасьніцы, патрабуйце ад гаспадарчых, прафэсыянальных, жактаўскіх, каапэрацыйных арганізацый, ад праўленьняў калгасаў больш увагі да бытавога абслугоўваньня.

Рабселькоркі, дэлегаткі, будзьце арганізатарамі мас працоўных жанчын у справе выкананьня дырэктыў ЦК аб дашкольным выхаваньні.

Ударым па апартуністых, якія недаацэньваюць усяго політычнага значэньня справы разгортваньня бытавых устаноў.

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

аб становішчы і пэрспэктывах разьвіцьця дашкольнага выхаваньня

Неабходнасьць далейшага ўцягненьня працоўных жанчын у вытворчае і грамадзкае жыцьцё краіны патрабуе асаблівай увагі да пытаньня бытавога разьняволеньня іх і ў першую чаргу арганізацыі грамадзкага камуністычнага выхаваньня дзяцей. Гэтая задача набывае зараз вялізарнае народнагаспадарчае значэньне і палітычную актуальнасьць у сувязі з недахватам рабочай сілы і неабходнасьцю шырокага ўцягненьня жанчын у вытворчасьць.

Між тым, становішча з разгортваньнем сеткі дашкольных устаноў і барацьбы за паляпшэньне якасьці работы ў іх, знаходзіцца ў яўна нездавальняючым стане. Усімі відамі школьных і дашкольных устаноў ахоплена толькі 13 процантаў дзяцей працоўных. Рад грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый (Наркамснаб, Белкаапсаюз, Калгасцэнтр, ВСНГ) зусім няўважліва адносяцца да задач дашкольнага выхаваньня, і недаацэньваюць ролі разгортваньня дашкольнага выхаваньня ў выкананьні гаспадарчых задач. З боку некаторых мясцовых, партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый і ў першую чаргу органаў Нарасьветы маюцца апартуністычныя адносіны да школьнай справы.

Выходзячы з гэтага ЦК **пастанаўляе:**

1. Даручыць НКА і Дзяржпляну не пазьней 1-га кастрычніка 1931 году скласьці плян увядзеньня ў БССР усеагульнага дашкольнага выхаваньня з тым, каб у 1932 годзе ахапіць ня менш 50 проц. усіх дзяцей дашкольнага ўзросту, у тым ліку ўсіх дзяцей рабочых.

У першую чаргу плянам павінна быць прадугледжана разгортваньне дашкольных устаноў пры прадпрыемствах з перавагай жаночае працы. Дзеці дашкольнага ўзросту прымежных раёнаў суцэльнай калектывізацыі павінны быць ахоплены дашкольнымі ўстановамі таксама ў 1932 г.

2. НКА разам з ЦСПСБ і Калгасцэнтрам не пазьней 1-га кастрычніка правесьці рэарганізацыю ўсёй сыстэмы дашкольнага выхаваньня, поўнасьцю прыстасаваўшы яе да патрэб вытворчасьці (увядзеньне трохзьменнасьці, вячэрніх і начных груп, поўнага пераводу іх на бесьперапынны тыдзень і г. д.).

3. У мэтах прыцягненьня грамадзкіх сіл і сродкаў для будаўніцтва дашкольных устаноў і ясьляй арганізаваць дашкольную каапэрацыю. НКА, ЦСПСБ неадкладна распрацаваць формы арганізацыі і зьмест работы гэтай каапэрацыі, унёсшы гэтыя палажэньні на зацьвярджэньне СНК БССР.

4. Прызнаць неабходным большы матар'яльны ўдзел грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый у справе дашкольнага выхаваньня. Даручыць Дзяржпляну, НКФіну пры ўдзеле НКА распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы з паказаньнем цьвёрдых сум, якія павінны быць асыгнаваны адпаведнымі гаспадарчымі і грамадзкімі арганізацыямі. ЦСПСБ, Белкаапсаюзу неадкладна ліквідаваць грашовую запазычанасьць на ўтрыманьне дашкольных устаноў.

5. Даручыць усім РК КП(б)Б, НКА, ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ уключыць дашкольнае выхаваньне ў адзіны плян культурнага будаўніцтва, як важнейшую частку апошняга. Забясьпечыць ва ўсёй рабоце па культпаходзе неабходную ўвагу дашкольнаму выхаваньню, шырока прыцягнуць грамадзкасьць да кантролю над працай дашкольных устаноў.

6. З мэтай падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для работы ў дашкольных установах даручыць НКА і Дзяржпляну значна пашырыць існуючую сетку дашкольных тэхнікумаў. Рашуча высоўваць на работу ў дашкольныя ўстановы калгасьніц, работніц і жонак рабочых, стварыўшы шырокую сетку курсаў па павышэньні іх кваліфікацыі. Стварыць дашкольнае аддзяленьне ў завочным пэдфаку і завочны дашкольны тэхнікум.

7. ВСНГ тэрмінова распрацаваць пляны пабудовы ў рабочых раёнах будынкаў для дашкольных устаноў, а таксама ўлічваць пры пабудове новых дамоў неабходнасьць забесьпячэньня дашкольных устаноў адпаведнымі памяшканьнямі. Белжылсаюзу вылучыць у ЖАКТ'ах адпаведную плошчу для разгортваньня дашкольных устаноў, поўнасьцю выканаўшы адвод устаноўленага процанту жыльлёвай плошчы (5 проц.) пад бытавыя ўстановы. Калгасцэнтру забясьпечыць адвод адпаведнай плошчы ў першую чаргу з ліку канфіскаваных кулацкіх будынкаў.

8. Наркамснабу і Белкаапсаюзу ўключыць у свае пляны забесьпячэньне дашкольных устаноў неабходнымі прадуктамі харчаваньня, адзеньнем і абсталяваньнем.

9. Прапанаваць ВСНГ і Белсампрамсаюзу арганізаваць выраб палітэхнічных прылад для дашкольных устаноў, стандартнага абсталяваньня і выраб цацак у разьмерах, забясьпечваючых патрэбу ў іх. НКА забясьпечыць належны пэдагагічны кантроль і кіраўніцтва гэтай работай.

10. У мэтах паляпшэньня матар'яльна-прававога становішча дашкольных працаўнікоў прыраўняць іх у нормах забесьпячэньня і культурна-бытавога абслугоўваньня да настаўнікаў школ сацвыху.

11. Даручыць БДВ, БелАПП'у, НКАсьветы наладзіць работу па выданьні масавай дзіцячай літаратуры. Узмацніць выданьне яе на нац. мовах. Мэтадкому НКА наладзіць выпуск адпаведных мэтадычных матар'ялаў па дашкольным выхаваньні.

12. Прапанаваць НКА распрацаваць плян арганізацыі дзіцячых гарадкоў пры буйных пралетарскіх цэнтрах з тым, каб у будучым годзе пачаць іх будаўніцтва.

13. Усім РК КП(б)Б праверыць становішча работы па абслугоўваньні дзяцей дашкольнага ўзросту і забясьпечыць 100 проц. выкананьне пляну разгортваньня дашкольных устаноў на гэты год.

14. Улічваючы вялікае палітычнае і гаспадарчае значэньне дашкольнага выхаваньня даручыць сэктару друку забясьпечыць зьмяшчэньне ў газэтах раду артыкулаў па гэтым пытаньні.

Палепшыць працу дзіцячых устаноў

(Бытавы рэйд работніц ф-кі „КАСТРЫЧНІК")

Бытавым рэйдам, які праводзіўся ўдарніцамі нашай фабрыкі, быў агледжан рад дзіцячых устаноў. Дзіцячы сад 1-га жакту абслугоўвае вялікую колькасьць дзяцей нашых работніц. Да гэтага часу сад меў слабую сувязь з нашым прадпрыемствам.

У часе рэйда загадчыца саду абяцала больш зьвязацца з работніцамі, каб вывучыць іх умовы працы і прыстасаваць сад да іх патрэб. „Сад для работніц, а работніцы для саду"— кажуць ударніцы. У мінулым годзе ў сад былі прыняты дзеці хатніх гаспадынь і наогул хто больш плаціў. Зараз трэба сад павярнуць да яшчэ большага і лепшага абслугоўваньня работніц, занятых на вытворчасьці.

Дзіцячыя сады 2-га і 3 га жакту яшчэ не перабудавалі сваёй работы на службу прамфінпляну. Рамонты садоў не адбыліся сваячасова, дзеці, вярнуўшыся з дачы, павінны былі застацца на дварэ. Гэта спрыяла нявыхаду на працу работніц. У хутчэйшым пачатку работы 3-га яўрэйскага саду пасьля рамонту ніхто не зацікаўлен, падлога ўжо некалькі тыдняў афарбавана, а загадчыца не заглядвае туды, каб расчыніць вокны для хутчэйшэй прасушкі падлогі. Наогул, трэба сказаць, у садзе адсутнічае парадак, дзеці ходзяць брудныміі.

Лепш абслугоўвае дзяцей работніц 8-мы дзіцячы сад. Ён ужо ўзімку перайшоў **на дзьвёхзьменную работу, сад працуе круглыя суткі бесьперапынна.** Большасьць дзяцей у гэтым садзе работніц фабрыкі „8-га сакавіка". **Работніца, якая ідзе на першую зьмену ў 6 гадзін раніцы, прыводзіць дзіця з вечара, дзе яно і начуе, а калі работніца працуе на другой зьмене, дзіця таксама начуе ў садзе, а раніцай матка яго забірае. Апрача гэтага працуе вячэрняя група для тых матак, якія вучацца або заняты грамадзкай працай.** Сад існуе на сродках ГАР'на, які адпускае на харчаваньне па 12 капеек на кожнае дзіця. Невялікую суму ўносяць бацькі, але гэта вельмі мала, бо дзеці ядуць 3 4 разы ў дзень. Трэба, каб бацькі былі больш зацікаўлены ў паляпшэньні працы ясьляй і ўносілі грошы адпаведна заработку сям'і, разьдзеленаму на лік едакоў.

МЦРК дагэтуль забясьпечваў сад усімі неабходнымі прадуктамі, але пры пашырэньні саду неабходна пашырыць водпуск прадуктаў, каб ня прыходзілася купляць на прыватным рынку.

Зусім **кепская справа з забесьпячэньнем дрывамі** амаль ва ўсіх садох, і гэта пагражае зрыву працы дзіцячых садоў, як гэта было ў мінулым годзе. **Усе сады павінна быць тэрмінова забясьпечаны дрывамі.**

Прыстасоўвае сваю работу да ўмоў вытворчасьці 4-ы ачаг, але ён ня мае таго вопыту, як 8-ы сад. **4-ы ачаг адарваны ад прадпрыемства і таму няправільна наладжана праца зьмен.** Напрыклад, першая зьмена ад 5 гадзін раніцы да 5 гадз. дня, другая зьмена ад 5 гадзін дня да 8 гадзін вечара. Вядома, такі расклад ня можа задаволіць работніц, якія працуюць на вытворчасьці.

Культсэктар фабрыкі „Кастрычнік" — раней **Малкіна**, зараз **Эскіна**—ніколі не абгаворвалі пытаньняў паляпшэньня бытавых умоў работніц, што спрыяла цякучасьці рабочай сілы.

8-ы сад зьяўляецца прыкладам па абслугоўваньні работніц і яго вопыт павінен быць падхоплен іншымі садамі.

Удзельніцы рэйду:

Падольская, Клейн, Гантман, Памяранц, Міндліна, Шварц, Лось, Мукасей, Мостак.



Дзіцячы сад у калгасе.

Справа шофэра Гарбачовай

Рэдакцыя часопісі „Беларуская работніца і сялянка“ атрымала заметку аб безгаспадарчасьці ў гаражы менскай кангоры Саюзтрансу і аб зьдзеках над шофэрам тав. Гарбачовай.

Камісія ў часе свай працы пры праверцы высьветліла, што ў гаражы пануе безгаспадарчасьць. Абязьлічка прыводзіла да таго, што адказнасьці за работу ніхто не адчуваў. Дрэнна рамантаваліся машыны. Многія шофэры рабілі паломкі. Вельмі слаба ў гаражы былі разгорнуты сацыялістычныя формы працы. З ліку 170 рабочых было толькі 36 ударнікаў. Трыкутнік гаражу ніякай палітвыхаваўчай работы не праводзіў.

Брыгадзір т. Кушнерова—рамшчыца. Торфзавод „Шлях Соцыялізму“.

У гаражы ня была разгорнута крытыка і самакрытыка. Насьценная газэта выходзіла толькі па сьвятах. На запытаньне прадстаўніка рэдакцыі, дзе рэдкалегія, старшыня мясцкому т. Малашка адказаў: „рэдкалегіі няма, зьбіраемся ўсе і выпускаем газэту“. Ніхто на заметкі не рэагаваў.

З боку Менскай кангоры рабочыя гаражу адчувалі толькі адміністраваньне. Загадчык Менскай кангоры тав. Крылоў, каб устанавіць дысцыпліну, так і сыпаў штрафамі. І ня дзіўна што пры такім становішчы ў гаражы была **спроба з боку адміністрацыі выжыць жанчыну-шофэра.**

Тав. Гарбачова работніца малапісьменная—паступіла на курсы шофэраў у Менску. Скончыўшы курсы, яна атрымала годнасьць шофэра і была накіравана на пастаянную работу ў гараж Саюзтрансу. У штыхі сустрэла адміністрацыя шофэра-жанчыну. Праз некалькі дзён Гарбачова была бяз усякай прычыны зволена з работы. Праз 3 месяцы яна была працсэсіяй гораду Менску адноўлена на рабоце. Варожа сустрэў увесь трыкутнік гаражу зварот тав. Гарбачовай. Шукалі выпадку даказаць нягоднасьць жанчыны-шофэра. І выпадак ня прымусіў сябе доўга чакаць. П'янаму мэханіку аднойчы здалося, што Гарбачова пры хуткай язьдзе задушыла сабаку. Гэтага было даволі, каб зьняць Гарбачову з машыны, прыпісаўшы адначасова ёй аварыю.

І замест таго, каб даць магчымасьць маладому шофэру-жанчыне набыць практычныя веды язды, **яе паставілі ў гаражы на чорную працу, прымусіўшы цягаць цяжкія грузы па 8—10 пуд.**

У рэшце, Гароачову прымацавалі да шофэра Пірага „ўдарніка“, які п'янствуе сапраўды па-ўдарнаму. Ён, нікому не заявіўшы, паехаў адзін, ня ўзяўшы з сабой Гарбачову. Трыкутнік гаражу на гэта не рэагаваў, а адміністрацыя пастаралася гэта скарыстаць, і залічыла Гарбачовай прагул, але потым прымушана была прызнаць сваю памылку.

Тав. Гарбачова нідзе не знайшла падтрыманьня. Загадчык гаражу Курбака, сакратар цэхавай ячэйкі **Кандрашкоў**, старшыня цэхкамітэту Малашка, як адзін, стараліся Гарбачову скампрамэтаваць, як шофэра. Недарма тав. Курбака заявіў прадстаўніку рэдакцыі часопісі „Беларуская работніца і сялянка“—мужчын буду садзіць на машыны, а жанчын не дапушчу, бо ў іх ня тое ў галаве“. Трыкутніка гаражу актыўна падтрымліваў кіраўнік Менскай кангоры Саюзтрансу тав. Крылоў. Ён ня мог прымірыцца з прысутнасьцю тав. Гарбачовай у гаражы.

Бюро парткалектыву было ў курсе справы тав. Гарбачовай, але ніякіх крокаў ня прымала. Наадварот, з боку бюро была спроба скампрамэтаваць камісію, якая занялася расьсьледваньнем справы Гарбачовай.

З мэтай выжыць Гарбачову з гаражу ёй даручаюць паламаную машыну з вялікім грузам і накіроўваюць ноччу за некалькі кілёмэтраў ад Менску.

Ноч была цёмная. Узьнялася навальніца. Нічога ня відаць, толькі маланка асьвятляла дарогу. Машына ліхтароў ня мела. Дождж сек у твар. І зразумела, малады шофэр Гарбачова пры такіх дрэнных абставінах уехала з машынай у яму.

Тав. Крылоў, ня доўга думаючы, **зволіў тав. Гарбачову з працы, ня гледзячы на тое, што інжынэр канстатаваў нявіноўнасьць яе ў аварыі.** Тав. Крылоў больш паверыў інструктару Саюзтрансу Вароніну, які выкарыстаў гэты момант і зьвёў асабісты рахунак з Гарбачовай, бо будучы на курсах, яна выкрыла гнойнік, дзякуючы чаму Варонін папаў пад суд.

Справа Гарбачовай была разгледжана на бюро скаргаў пры ЦКК-РСІ і вынесена бальшавіцкая пастанова: **аднавіць Гарбачову на рабоце.**

Адміністрацыйнае, партыйнае і прафэсыянальнае кіраўніцтва Саюзтрансу да гэтага часу не ўявілі сабе значэньня дырэктывы партыі аб укараненьні жаночай працы ў вытворчасьць. У справе тав. Гарбачовай яны праявілі яўны апартунізм на практыцы.

Пастанова ЦКК аб аздараўленьні працы гаража павінна быць неадкладна выканана.

Ч.

Зварот ударнікаў з падарожжа вакол Эўропы на цеплаходзе „Украіна“.



Лён

Апавяданьне

В. Галіны

(Працяг)

III

Над сенажацьцю дзень гарачы зьвініць. Пах сена распаранага з паветра капае. Пад поўдзень сонца сталі панаджваць хмаркі з грабенчыкамі чорнымі. Вылазячы з-пад хмары, сонца яшчэ жарчэй прыпякае тоўстыя пузатыя рады скошанай травы.

— Гэй, Пятро, пятку падрэжу!—жартуе Андрэй.

Шапаціць сена мурожнае, шурпаціцца, узьлятае над граблямі ў руках дзявочых. Дзяўчаты ў валох куляюцца, адна перад другою складкамі хваляцца.

А на гары дуб, дуб
яшчэ не разьвіўся.
У Андрэя ўдалы чуб,—
хлапец не жаніўся.
Запрагу я кацяня,
ды шчэ курку чубату,
вязі пара вараная
мяне к дзеўцы гарбатай.

Апанас паглядзеў на работу жаночую.

— На сябе дзяўчаты робіце, не па-гаспадарску. Хмарыць, а вы куляецеся! Работа ў вас робіцца, як мокрае гарыць.

— А ў Марылі? Навошта булку здобную гадуеце? — накінуліся некалькі дзяўчат.

— Хадземце палуднаваць!

На сенажаці хлеб пірагом. За абедзьве шчокі яду закладваюць, малаком запіваюць. Моладзь прыдумляе.

— У ядзе Пятро лепшы ўдарнік.

— Ён ударны токар па хлебе.

— Солі прывёз?

— Забыўся.

— У яго памяці сёньня дзень адпачынку.

— Жарты жартамі, ударнікі, а вы спрытней. Трэба ўправіцца, згрэбці сухое, у копы паскладаць да дажджу,—сунімае Трахім.

— Пятро да яды, а бацька яго да сну ўдарнік.

— Ён-жа касец, а бацька яго каваль.

— Толькі падумайце, браткі, такі малады Пятрусь, а ўжо сын каваля.

— Ну, перакусілі і за працу! Ты, Андрэй, можа сходзіш пад раку, перакажаш там, каб некалькі касцоў далі грабельнікам у падмогу.

Андрэй абагнуў бярэзьнік і сьцежка вілястая прывяла яго на грудок. З грудка і рэчка, і бярэзьнік відны. Прашоў беражком, уніз глянуў. У кустох галасы і квяцістае нешта мітусіцца, клубком круціцца. Хлапец бліжэй падаўся. Дзяўчына ідзе і два хлапчукі з ёю адзін ад другога кошык вырываюць.

Ніхто з драчуноў не заўважыў, як падбег Андрэй, за каўняры схапіў хлапчукоў. У дзяўчыны кошык з малінаю ў руках, вочы сьлязою блішчаць. Глянуў Андрэй, а вочы тыя — дзьве журавіны сьпелыя. Андрэй пазнаў Марылю, Ныркі Сямёна дачку.

— Што тут у вас за вайна?

— Маліну адабраць хацелі разбойнікі, — плаксіва жаліцца дзяўчына.

Андрэй не выпускаў з рук вінаватых.

— Ну, прызнавайцеся!

Белабрысенькі носам шмаргануў.

— Мы раскулачыць яе хацелі.

Марылю краска заліла, вочы бліснулі, а губы шчыльней падабрала. Ашарашаны „палітычнай фармулёўкай“ белабрысенькага жэўжыка, Андрэй выпусьціў дзіцячыя каўняры і ледзь стрымаў сябе, каб ня пырснуць ад сьмеху.

— Бяжэце, і каб гэтага больш ня было, каб ня кідаліся на людзей у кустох, ягад захацелі, ласуны, назьбіраць трэба.

Апошніх настаўленьняў Андрэевых хлопчыкі, вядома, ня чулі. Вырваўшыся, з піскам і сьвістам, яны кінуліся ў кусты.

Андрэй зрабіў крок, каб ісьці сваёю дарогаю, але азірнуўся на дзяўчыну. Марыля папраўляла косы, якія растрапаліся ў часе тузаваньня з малымі. Андрэй упікнуў.

— Чаму не на працы?

— Галава балела з ранку.

— А зараз?

— Перастала,— адказала дзяўчына і ўсьміхнулася.— Да рэчкі вы? І я пайду туды, пакупацца ахвота...

Пашлі.

— Дык ты сёньня прагульшчыца, так і дзяўчата казалі ўсе.

— Я прывыкла да іхняй няласкі.

„Ну і дзеўка, бы бярэзіна гібкая“—падумаў Андрэй.

Марыля нібы ўгадала думкі Андрэевы, вужом чуецца каля яго, касою шыю абвіла, у вочы заглядвае асьмеленая сваім хараством.

— Вось яна самая—„булка здобная“—успамянуў Андрэй словы дзявочыя. А Марыля са сьмехам:

— Хто вам лапці барсае.

— Ня толькі барсаю сам, а нават паплесьці магу і табе.

— Мне татка на чаравікі грошай не пашкадуе. Ён не такі скупы, як вы.

— Адкуль ты ўзяла, што я скупы?

— Напэўна кажу: з гораду скрыні цяжкія прывезьлі, каб тут у лапці абуцца.

— Вось і рэчка. Я да хлапцоў. Бывай. А скрынямі маімі пахваліцца магу. Прыходзьце ўвечары як-небудзь з дзяўчатамі, пакажу ўсё багацьце.

— Прывесьці трэба, а то самі зблудзім, дарогі ня знойдзем.

* * *

Лапцямі Андрэй падмінаў ветрам нахіленую траву. Перадаўшы на вучастку загад старшыні, Андрэй захапіў з сабою некалькі чалавек і разам з імі сьпяшаўся да радоў сухое травы.

— Як арэх,— нагнуўшыся над пракосам, пакруціў галавою пажылы калгасьнік.

— Няўжо ня выратуем ад дажджу?—падумаў Андрэй. У ім нарадзілася прагнае жаданьне перамагчы стыхію — зграбці сена да дажджу.

— Можна гэта, можна зрабіць,—меркаваў ён. Зноў перад вачыма Сашка Яршоў з ліста-пракатнага замаячыў.

— Такога-б Сашку сюды, на дапамогу.

Апанас глядзеў на край неба, завешаны цяжкаю чорнаю хмараю. Ён успамінаў галодную бяскормную вясну, калі на сечку стаду выскубалі стрэхі, калі загаладаных кароў прыходзілася паднімаць. Нешта ледзяное сашчапіла яму грудзі да болю. Ён схамянуўся толькі тады, як пачуў Андрэеў голас:

— Браткі,— гукнуў Андрэй,— ці мы-ж самі сабе ворагі. Дайце па-рабочаму, па-гаспадарску, па-ўдарнаму, брыгада перад брыгадаю навыперадкі.

З-пад хмары рвануў вецер. Разам з ветрам з граблямі Андрэй кінуўся да радоў сена.

Ніхто ня пярэчыў ні словам. Моўчкі, як перад неспадзяванай пагрозай, рушылі да работы.

У самым разгары Паўліха агрызнулася да Міхаліны:

— Не забягай уперад.

— А ты не адставай,—адказала Міхаліна і яшчэ шустрэй рванула грабільна.

Паўліха ўбачыла, што адстае толькі яна адна, падналягла, апынулася ўровень з усімі.

Калі брызнулі першыя буйныя кропкі дажджу, у радох не засталося ніводнай сяніны.

Ужо тыдзень, як разам з землякамі Андрэй праводзіць і сустракае расу. Яшчэ ў горадзе надумаўся ён: ня з боку параду даваць, а поплеч стоячы. У гэтым меркаваньні сваім ён адчуваў асаблівы сэнс. Такі кожныя рукі да рэчы, але справа ня ў гэтым. Быць разам, у гурце ад цямна да цямна, значыць хутчэй па жывых людзях зразумець вялікі зрух вёскі. А новай Раківаўку Андрэй яшчэ ня бачыў.

Першыя дні сьпіна ныла, але зусім хутка стаў у сваю каляіну. Скіне сарочку і голы да пояса, як калісь юнакам, плечы разьверне. Засмаліла сонца дужыя плечы, Смуглявым лоскатам мазанула. Вольна дышацца ў прасторах. Адчуваў ён, як дагэтуль ня слабыя рукі наліваліся новай сілай палёў.

Суседзі адзін у аднаго здагадкі выменьваюць, больш дапытлівыя напрасьцяк:

— Андруша!—Го?— Майстравы ты?—Ну?

— Газэта піша, што ў горадзе нарасхват майстравых.

Мы раскулачыць яе хацелі.

— Так.

Мнецца сусед з нагі на нагу.

— Жыцьцё ў горадзе чыстае, тутунь пахучы... Няўжо месца не хапіла, што прыгнала цябе на нашу працу, сельскую?

— А ты як думаеш?—усьміхаецца Андрэй.

— Людзі па-рознаму мяркуюць: хто кажа — правінаваціўся ты ў нечым, назад адаслалі, а хто думае проста засумаваў па зямельцы, па бацькаўшчыне.

— Ня тое і ня другое. Не прагналі мяне, а па-добраму выправілі да вас на падмогу.

Задумаецца дапытлівы.

— Няўжо адзін касец вывезе? Адны рукі больш ці менш у аднэй гаспадарцы скмеціш, а ў такой махіне і знаку няма.

— Ня ў тым загвоздка,—адказвае Андрэй і мяркуе, як-бы думкі свае выразьней перадаць.

І людзі пазьбіраюцца, гаворку слухаюць.

— На заводзе ў нас па-іншаму працуюць. Чулі напэўна пра ўдарнікаў.

— Чулі, то чулі,— вылазіць наперад Мірон, і рукі ў кішэні глыбей запіхае.

— Міхаліна, далажы, што там на зьезьдзе вашым камсамольскім пра ўдарнасьць казалі.

— На зьезьдзе нашым там казалі: таму калгас, каб праца па пляне была, каб ня бегаў кожны з месца на месца, а за адно нешта адказваў. Яшчэ казалі нам, што гадзіны трэба шчыльней паскладаць, тую-ж самую працу спраўней рабіць. Што працу трэба так арганізаваць, каб гультай за працавітага не хаваўся.

— Ня так, як граблі вы ўчора,—упікнуў Апанас.

— Зялёная ты, каб вучыць нас,— локцямі расьпіхае натоўп Мірон.—Мы зроду ўдарнікі, з самага маленства. У горадзе, што: гайка дык гайка, праца адна. Ня капае над табою, вясна з зімою пальцам ня ківаюць. А ў нашай працы кожны шавец і жнец і ў дуду ігрэц. Вось тут і ўдарнічай.

— Кажа „ўдарнікі“. А ці ўсе хоць-бы на работу выходзяць?— Не да Мірона, а да калгасьнікаў зьвярнулася Міхаліна.

(Працяг будзе).

Парады агранома

Змагайцеся са шкоднікамі сьвірнаў

Кожны год шкоднікі насеньня ў сьвірнах прыносяць страту каля 300 мільёнаў рублёў, таму аднэй з асноўных задач па ахове ўраджаю павінна быць барацьба са шкоднікамі на складах.

У калгасах і саўгасах цяпер будуецца шмат складаў для ссыпкі насеньня. Трэба пры пабудове іх зьвярнуць увагу на наступнае: сьвірны будаваць на высокіх і сухіх мясцох, падмурак будаваць на каменьнях, сьвіран павінен мець добрую вэнтыляцыю і многа сьвятла. Дах павінен быць пабудованы шчыльна.

Пры паступленьні насеньня ў склад яно павінна мець вільгаці ня звыш 13,5 проц., а калі процант будзе вышэйшы, дык насеньне трэба прасушыць.

Са шкоднікаў насеньня больш за ўсё прыносяць страту сьвірнавы **даўганосік, збожавая моль і мучны клешч.**

Збожжавая моль: а) матыль; б) лялечка;

Сьвірнавы даўганосік—гэта жучок, які мае карычневы колер. Пярэдняя частка яго цела выцягнута ў хабаток. Ён выядае ў насеньні нутро, пакідаючы адну шкарлупу. Самка даўганосіка ў сярэднім адкладвае каля 150 штук яек, у кожнае зерня па адным. Даўганосік вельмі выносьлівы, можа пераносіць марозы да 20 градусаў і жыць без яды каля 3 месяцаў.

Збожжавая моль—матыль, які мае бледна-срабрысты—шэры колер з карычневымі і чорнымі плямкамі. Самка збожжавай молі адкладвае каля 70 штук яек, з якіх праз невялікі тэрмін выходзіць вусень, які і зьнішчае насеньне. За час свайго жыцьця кожны вусень псуе каля 40 зярняў.

в) вусень. Кучка пашкоджанага насеньня.

Мучны клешч мае даўжыню ня больш 0,7 *м. м.* Простым вокам яго цяжка ўбачыць, бо ён ня мае колеру—бясколерны. Самка кляшча можа класьці яйкі на муку, з іх выходзяць чарвячкі, якія адрозьніваюцца ад дарослага кляшча меншым разьмерам. Праз 3—4 дні чарвячкі ператвараюцца ў лялечку, з якое праз тыдзень выходзіць клешч. Мучны клешч наносіць вялікую страту муцэ, ад чаго яна атрымлівае другі пах і ня можа ўжывацца як жыўнасьць.

Меры барацьбы з сьвірнавымі шкоднікамі. Усе меры барацьбы падзяляюцца на папераджальныя і зьнішчальныя.

Папераджальныя меры барацьбы. Для таго, каб шкоднікі не зьявіліся ў сьвірне, трэба трымаць яго ў чыстаце, вымятаць чыста сьмецьце, зьнімаць павуціньне і паліць, яго. Калі ў сьвірне будуць заўважаны шкоднікі, патрэбна падлогу прамыць моцным шчолакам, а пад падлогай пасыпаць сьвежа гашанай вапны з разрахункам на 1 кв. мэтр 500 грам вапны. У вялікія маразы зімою кідаць сьвірны адчыненымі на доўгі час. Ад марозу таксама гіне шмат шкоднікаў.

Вялікую ролю ў перавозцы шкоднікаў насеньня са складу на склад адыгрываюць мяшкі, бо ў швох і складках мяшкоў заўсёды хаваюцца шкоднікі. Таму іх патрэбна перад насыпкай вывернуць, добра выбіць жорсткай шчоткай. Бруд і сьмецьце ад мяшкоў трэба спаліць. Зімою мяшкі трэба праветрываць пры 20 градусах марозу на працягу 24-х гадзін.

Зьнішчальныя меры барацьбы. Лепшым сродкам барацьбы са шкоднікамі сьвірнаў будзе правядзеньне газавай дэзынфэкцыі. Робіцца газавае акурваньне тады, калі склад вельмі шчыльны і з яго ня можа выйсьці газ. Для акурваньня неабходна ўжываць хлёрапікрын і серкавы газ.

Хлёрапікрын—гэта вадкасьць жоўтаватага колеру, вельмі ядавітая. Ад агню не выбухае і не запальваецца. Газы хлёрапікрыну зьнішчаюць усіх шкоднікаў насеньня. На адзін куб. мэтр сьвірну бярэцца 20 грам хлёрапікрыну. Для акурваньня памяшканьня спачатку вылічваецца кубатура, а потым узважваецца неабходная колькасьць хлёрапікрыну. У сьвірне хлёрапікрын разьліваецца ў міскі.

Серкавы газ атрымліваецца шляхам спальваньня серкі на жалезных лістох. Для лепшага спальваньня дадаецца яшчэ салетра (на 25 частак серкі адна частка салетры). Калі серка будзе ў кавалках, яе трэба расьцерці ў парашок. На 10 куб. мэтраў патрэбна браць адзін *кго* серкі.

Пры акурваньні серкай або хлёрапікрынам памяшканьне шчыльна зачыняецца. Праводзіць акурваньне патрэбна ў процігазе. Акурваньне праводзіцца ад 24-х да 48 гадзін. Пасьля гэтага памяшканьне патрэбна добра праветрыць. Калі-ж памяшканьне немагчыма будзе акурваць з-за нящчыльнасьці сьцен і дзьвярэй, тады перад ссыпкай насеньне патрэбна апырскаць вапнава-газавай эмульсіяй. Для гэтага перад апырскваньнем робіцца ачыстка і спальваньне сьмецьця. Вапенна-газавая эмульсія падрыхтоўваецца наступным чынам: бярэцца 2 *кгр* нягашанай вапны, якая гасіцца і распускаецца ў 10 літрах вады, пасьля гэтага дадаецца 1 *кгр* газы. Апырскваць вапенна-газавай эмульсіяй трэба так, каб вадкасьць пападала ва ўсе шчыліны сьцен і столі.

Аграном Маркавец.

Цана асобнага нумару 10 к.

1121

Правілы даеньня кароў

1. Пачынаючы даіць карову, трэба странна абмываць цеплаватай, але не гарачай, вадой вымя і саскі і выціраць іх насуха чыстым ручніком. Таксама робяць і пасьля сканчэньня даеньня.

2. Першыя цурочкі выдаенага малака ня прымаюць у дайніцу, а выдойваюць на падлогу, бо гэта найменш каштоўнае і пры гэтым найбольш забрудненае малако. Прыёмка яго ў дайніцу магла-б заразіць увесь удой, бо гэтыя першыя цурочкі малака змываюць увесь бруд і пыл, які пападае ў сасок і на сасок.

3. Ня трэба змазваць саскі малаком, як гэта часта робяць у нас, бо гэта толькі забрудняе ўдой, а змочаныя саскі зморшчваюцца, і скура на іх трэскаецца. Лепш за ўсё змазваць саскі, у выпадку патрэбнасьці, сьвежым кароўім маслам.

4. Выдойваць неабходна да канца, г. зн., каб не засталося ў вымі зусім малака. Гэта неабходна таму, што пад канец даеньня выдзяляецца самае густое і самае тлустае малако. Апрача таго даеньне дачыста падтрымлівае і таксама павялічвае дачу малака каровай. З гэтай мэтай пад канец даеньня патрэбна вымя добра расьціраць.

5. Даіць трэба без перапынку, хутка і моцна. Цурочкі малака з-пад рукі даільшчыцы павінны д айніцы здуваць пену.

6. Абыходзіцца з жывёлай у часе даеньня трэба ласкава, не рабіць грубых крыкаў.

7. Даіць неабходна ці перад раздачай корму, ці пасьля раздачы, каб пасьпеў ўлегчыся пыл ад сухога корму (сена ці саломы) і ўстанавілася цішыня на скотным дварэ.

8. Лепш садзіцца на лавачку з левага боку, бо пры гэтым для правай, больш фізычна разьвітай рукі прыходзяцца найбольшыя тугія заднія саскі. Але да даеньня з левага боку трэба прывучаць карову, як толькі яна ацеліцца.

9. Пры даеньні неабходна захватваць саскі накрыж, г. зн. пярэдні правы і задні левы, бо пры такім даеньні раздразьняюцца абедзьве палавінкі малочнай залозы.

10. Даіць неабходна кулаком, ахапіўшы сасок усімі пальцамі. У нас дояць звычайна адцяжкай саска, г. зн. ахапіўшы сасок вялікім і ўказальным пальцамі і адцягваюць яго ўніз. Жывёла ад гэтага адчувае вялікі неспакой. Даеньне кулаком, г. зн. выціскаьнем заслугоўвае ўвагі і пашырэньня, бо менш турбуе жывёлу. Даеньне гэта праходзіць так: сасок ахапляецца кулаком, г. зн. усімі пяцьма пальцамі, якія сьціскаюцца папераменна. Наперад за ўсё сьціскаецца аснова саска ўказальным пальцам, потым паступова сьціскаюцца іншыя пальцы і малако пераганяецца з вёрхняй часьці соска ўніз і потым у дайніцу.

11. Кароў з вялікімі саскамі неабходна даіць ці пры дапамозе даільных трубак, ці надзеўшы на саскі гумовыя пальцы, зрэзаўшы іх канцы.

12. Малочных кароў неабходна даіць ня менш трох раз у суткі, па магчымасьці праз аднолькавыя прамежкі часу, г. зн. праз 8 гадзін.

Толькі пры захаваньні ўсіх гэтых правіл можна дасягнуць найвышэйшай прадукцыйнасьці калгаснага стада з аднаго боку, і з другога боку павысіць прадукцыйнасьць працы даільшчыцы ці даільшчыка ў дзень да 60 літраў (5 вёдзер) малака.

Праф. В. Кацельнікаў.

Што зроблена па допісах рабселькорак

Разгарнулі працу сярод жанчын

Крупскі РК КП(б)Б паведамляе, што заметка аб тым, што ў саўгасе „Каменка" працы сярод жанчын ня было, і партячэйка саўгасу спала, пацьведзілася.

Зараз разгортваецца праца сярод жанчын.

Знахарка Салавей будзе прыцягнута да адказнасьці

Допіс аб знахарскай працы і аб абортах Салавей пацьвердзіўся. Салавей раз судзілі за такія дзеяньні. Зараз справа расьсьледуецца і Салавей будзе прыцягнута да адказнасьці.

Палепшылі працу ясьляй

Глуская РКК РСІ паведамляе, што факты, прыведзеныя ў допісе „Сарвалі адкрыцьцё ясьляй", аб тым, што каапэрацыя ня выдала абсталяваньня і неабходных прадуктаў для ясьляй,—правільныя. Прыняты захады да зьнішчэньня гэтых недахопаў. Зараз ясьлі працуюць здавальняюча.

* * *

Факты, паказаныя ў допісе „Трэба зжыць бюракратаў", аб кепскім становішчы гарадзкіх дзіцячых ясьляй, цалкам пацьвердзіліся. Аршанская РКК РСІ прапанавала перагледзіць склад усіх дзяцей, якія наведваюць ясьлі, разгрузіць ясьлі ад дзяцей,—пераросткаў. Райздраву прапанавана у трохдзенны тэрмін зрабіць дэтальны агляд ясьляй, шырока правесьці платнасьць з мэтай паляпшэньня становішчча ясьляй і іх пашырэньня.

З гэтым нумарам усім падпішчыкам рассылаецца ВЫКРАЙКА жаночай кофты

ЗДАВАЙЦЕ
ПАДПІСКУ
НА ЧАСОПІСЬ
БЕЛАРУСКАЯ
РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА
ЧАСОПІСЬ
ВЫХОДЗІЦЬ
3 РАЗЫ
Ў МЕСЯЦ
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
МЕНСК, САВЕЦКАЯ 63,
3-І ПАВЕРХ, ПАКОЙ № 11.

Выданьне ЦК КП(б)Б. *Рэдактар* Э. Шаніра.

Друкарня імя Сталіна Заказ № 1864. У ліку экз. 18.870 Галоўлітбел № 434